Пралетарыі ўсіх краёў, злучайцеся!

Савецкая Беларусь

Орган Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту Саветаў БССР.

АДРЭС РЭДАКЦЫІ: МЕНСК, рог вуліц Ленінскай і Карла Маркса (2-гі Дом Саветаў).

ТЭЛЕФОНЫ: Рэдакцыі—№ 473. Рэдактара—№ 769.

Матар'ял прымаецца—з 9-й да 3½ гадз.

Навыкарыстаныя рукапісы назад аўтарам не завочаюцца.

КАНТОРА: Менск, рог вуліц Ленінскай і Карла Маркса. Тэлефон № 244. (2-гі Дом Саветаў).

ПАДПІСНАЯ ПЛАТА: На 1 месяц — 90 к. „ 3 „ 2 р. 70 к. „ 6 „ 4 р. — к. „ 1 год 8 р. — к. Змена адрасу: іншагародняя — 20 к. мясцовыя — 10 к.

ПЛАТА ЗА АБВЕСТКІ: За радок пашпарэлі пасьля тэксту — р. 50 к. За радок пашпарэлі пасьлядо тэксту 1 р. — к. За радок пашпарэлі перад тэкстам 1 р. 50 к. Сьпешныя на 50 проц. дарожэй. Зьвыш тарыфу бярэцца 10 проц. налогу.

ПЛАТА ЗА ПУБЛІКАЦЫІ: За 1 дакумант 25 коп. За кожны дадатковы 15 „ Беспрацоўн. і чырвонаармейцы за дакумант 15 „ За кожны дадатковы 5 „ Публікацыі ЗАГС'ту—3 руб.

ПАДПІСКА ПРЫМАЕЦЦА ў канторы газэты, на ўсіх аддзяленьнях Беларускага Дзяржаўнага Выдавецтва і на ўсіх пашт.-тэл. канторах. АБВЕСТКІ ПРЫМАЮЦЦА канторай газэты: Менск, рог Ленінскай і Карла Маркса (2-гі дом Саветаў).

КОШТ НУМАРУ 5 КАП.

9 ГОД ВЫДАНЬНЯ. ШТОДЗЁННАЯ ГАЗЭТА. № 248 (2436) Пятніца, 26-га кастрычніка 1928 г.

РЭЗАЛЮЦЫЯ

па дакладу тав. Васілевіча аб чарговых задачах сацыялістычнага будаўніцтва, прынятая аднагалосна Менскім гарадзкім парт. актывам 24-X-1928 г.

Заслухаўшы і абгаварыўшы даклад тав. Васілевіча аб чарговых задачах сацыялістычнага будаўніцтва, актыў Менскай гарадзкой парт. арганізацыі цалкам і поўнасьцю далучаецца да адозвы ЦК УсеКП(б) да ўсіх сяброў Маскоўскай арганізацыі і да рэзалюцыі аб'яднанага пасяджэньня бюро ЦК і Прэзыдыуму ЦКК КП(б)Б.

Актыў са задавальненьнем адзначае, што ў выніку актыўнага падтрыманьня ЦК УсеКП(б), пры дапамозе нізавых парт. арганізацый, Маскоўскім камітэтам прыняты ўсе неабходныя меры да выпраўленьня памылак, дапушчаных у кіраўніцтве.

Разам з тым актыў з вялікім задавальненьнем адзначае, што Маскоўская парт. арганізацыя застаецца адзінай, маналітнай, галоўнай апорай ЦК у рашучым правядзеньні ў жыцьцё ленінскіх заветаў па сацыялістычнаму будаўніцтву краіны.

Разам з правядзеньнем у жыцьцё пастановы XV-га зьезду УсеКП(б) і XI-га зьезду КП(б)Б аб індустрыялізацыі краіны, разам з правядзеньнем рашучага курсу па калектывізацыі сялянскай гаспадаркі, з адначасовым узмацненьнем наступу на кулацкія пласты вёскі, завастрылася клясавая барацьба ў краіне і асабліва на вёсцы.

Цяжкасьці перажываемага намі пэрыяду зьяўляюцца цяжкасьцямі не заняпаду, а росту, у сувязі з неабходнасьцю вялікіх капітальных затрат у мэтах рэканструкцыі народнай гаспадаркі. Гэтыя цяжкасьці выклікаюць хістаньні пасобных найменш устойлівых зьвеньняў нашай партыі, якія, упаўшы ў панiку, імкнуцца ставіць пытаньне аб перагледзе рашэньняў XV-га зьезду партыі ў бок зьмены курсу і паслабленьня тэмпу індустрыялізацыі, у бок недапушчэньня калектывізацыі сельскае гаспадаркі, а таксама ў бок паслабленьня чакыму на верхавінныя пласты вёскі.

Гэтыя-ж цяжкасьці імкнуцца выкарыстаць і контр-рэвалюцыйныя рэшткі былой трацкісцкай апазыцыі.

КП(б)Б. працуючая ў краіне пераважна сялянскай, у абкружэньні значных пластоў гарадзкой і местачковай дробнай буржуазеі, не можа не адчуваць націску з боку гэтых абкружаючых абставін — адсюль значная небясьпека правых ухілаў у шэрагах нашай арганізацыі.

Актыў з вялікім задавальненьнем адзначае, што Бюро ЦК КП(б)Б, прэзыдыум ЦКК і пленум Менскага Акруговага Камітэту сваечасова зьвярнулі ўвагу парт. арганізацыі на небясьпеку як трацкісцкіх, так і правых апартуністычных ухілаў, на неабходнасьць самай рашучай барацьбы з імі, а таксама і з прымірэнчымі адносінамі да гэтых ухілаў.

Актыў зьвяртае ўвагу партыйных арганізацый на неабходнасьць пры правядзеньні справаздачнай і перавыбарчай кампаніі партыйных органаў завастрыць увагу ўсёй партарганізацыі на неабходнасьць рашучай ідэёвай барацьбы з усялякімі ўхіламі і хістаньнямі, накіраваўшы зараз галоўны ўдар на больш небясьпечны і яшчэ недастаткова ўсьведомлены сярод шырокіх колаў партыі правы ўхіл, вядучы рашучую барацьбу са ўсімі тымі, хто патрабуе перагляду генэральнай лініі партыі і прымірэнча адносіцца да апартуністычных ухілаў.

Актыў лічыць, што кожнае імкненьне вярнуць партыю назад ад рашэньняў XV зьезду УсеКП(б) і XI зьезду КП(б)Б, вядзе да відавочнага разрыву з ленінізмам.

У сучасных умовах толькі няўхільнае правядзеньне ў жыцьцё рашэньняў XV-га зьезду УсеКП(б) і XI-га зьезду КП(б)Б, пад неаслабным кіраўніцтвам Ленінскага ЦК, забясьпечыць партыі і рабочай класе далейшае пераможнае прасоўваньне ўсёй нашай краіны да сацыялізму.

Аснoўныя вехі, намечаныя партыяй на XV-м зьезьдзе і разьвітыя ў рашэньнях пленумаў ЦК УсеКП(б) і КП(б)Б, зьяўляюцца адзіным ленінскім шляхам, па якім партыя прыдзе да перамогі.

Толькі па шляху індустрыялізацыі нашай краіны, не зьмяншаючы тэмпу індустрыялізацыі, разьмеру і асноўнага напрамку, партыя зможа забясьпечыць будаўніцтва сацыялізму ў нашай краіне і поўную перамогу пралетарскай рэвалюцыі.

Толькі шляхам наўкальнай інтэнсыфікацыі і індустрыялізацыі сялянскай гаспадаркі, праводзячы ленінскі кааперацыйны план калектывізацыі вёскі, адначасова ўтвараючы буйныя дзяржаўныя сельска-гаспадарчыя фабрыкі (саўгасы), партыя і рабочая клясе пераможа тыя цяжкасьці, якія вырастаюць на нашым шляху ў сувязі з рэканструкцыяй нашай народнай гаспадаркі.

Толькі шляхам самакрытыкі наша партыя будзе разгортваць актыўнасьць усёй масы рабочае клясы і зможа накіраваць гэту актыўнасьць у сацыялістычнае лагер супроць кулака, супроць нараджэньня новай буржуазеі, супроць бюракратызму.

Актыў Менскай гарадзкой арганізацыі вітае Цэнтральны Камітэт УсеКП(б), які нясупынна і няўхільна праводзіць правільную ленінскую лінію і вядзе рашучую барацьбу з усялякімі ўхіламі, адкуль-бы яны ні выходзілі.

Актыў заклікае ўсіх членаў КП(б)Б згуртавацца вакол свайго Цэнтральнага Камітэту—вернага праваднika ленінскай лініі—ЦК УсеКП(б).

За згуртаванасьць і бальшавіцкае сталёвае адзінства нашай арганізацыі, на аснове прынцыпаў Ленінскай лініі, на аснове рашэньняў XV-га зьезду УсеКП(б)!

Супроць хістаньняў у палітыцы партыі! Няхай жыве ЦК УсеКП(б), які рашуча вядзе партыю па правільнаму шляху сацыялістычнага будаўніцтва!

АГЛЯД ГРУП БЕДНАТЫ.

Ліст ЦК УсеКП(б).

Усім ЦК нацкампартый, крайкомам, абкомам, губкомам, акругкомам і павятовым камітэтам УсеКП(б).

Дарагія таварышы! У зьвязку з надыходзячай кампаніяй перавыбараў саветаў ЦК пастанавіў наладзіць агляд груп беднаты, а таксама склікаць канфэрэнцыі гэтых груп.

Праца па арганізацыі батрацтва і згуртаваньню беднаты, якая зьяўляецца апораю рабочае клясы на вёсцы, ёсьць найважнейшая задача нашае масавае палітычнае працы. Асабліва палітычнае значэньне гэтая праца набывае ў сучасны пэрыяд—пэрыяд абвастрэньня клясавае барацьбы на вёсцы, калі разгортваньне сацыялістычных элемэнтаў сустракае моцны адпор з боку кулакоў. У гэтых умовах арганізацыя беднаты павінна быць у першую чаргу накіравана на ліквідацыю ў саветах і кааператывах уплыву кулацкіх і наогул клясава-варожых элемэнтаў і на ўзмацненьне на гэтай падставе нашага саюзу з сярэдняк сялянствам. Толькі пры гэтых умовах магчыма сапраўды ажыцьвіць саветы, сапраўды ажыцьцёвіць ленінскі кааперацыйны план і масавы рост элемэнтаў калектывізму ў сельскай гаспадарцы. Між тым ня толькі ў час леташніх мінулагодніх хлебазагатовак, але і зараз у шмат якіх выпадках кулацтва робіць новыя спробы актыўнага процідзейнічаньня працы саветаў па абароне інтэрэсаў бяднейшых гушчаў вёскі, разьвіцьцю калгаснага будаўніцтва, захоўваючы ў некаторых выпадках поўны ўплыў на асобныя праслоўкі сярэдняга сялянства. Гэтае процідзейнічаньне выяўляецца часамі ў простых нападах на актыўных савецкіх і грамадзкіх працаўнікоў з батрацтва, беднаты і сярэдняга сялянства (селькораў, кіраўнікоў савецкаю працаю), а часамі—у падпалах калгасаў, папсаваньні грамадзкіх машын і г. д. Апроч таго кулацкія элемэнты моцна імкнуцца праз сектантаў і царкву скарыстаць рэлігійныя забабоны адсталых гушчаў сялянства ў сваіх палітычных мэтах.

Не зважаючы на шэраг дасягненьняў, на поўны рост арганізаванасьці і актыўнасьці батрацтва і беднаты пасьля 15-га зьезду партыі—усё такі працу сярод беднаты трэба прызнаць слабаю. Цэлы шэраг дырэктыў партыі аб узьняцьці справы арганізацыі беднаты і асабліва батрацтва праводзяцца нездавальняюча. Таму **трэба дамагчыся ў гэтай працы партарганізацый, камсамолу і ўсяе савецкае грамадзкасьці рашучага зруху наперад.**

ЦК надае вялікае значэньне наладжваньню агляду груп беднаты і правядзеньню канфэрэнцый гэтых груп. Партыйныя, камсамольскія і прафсаюзныя арганізацыі, пачынаючы з вясковых ячэек, працаўнікі саветаў, кааператываў і шэфскіх таварыстваў, а таксама селькоры і дэлегаткі, павінны быць прыцягнуты да правядзеньня праверкі. Неабходна шырока выкарыстаць і насьценныя газэты.

На сваім зьмесьце **агляд павінен асьвятліць наступныя пытаньні:** 1) удзел беднаты і батрацтва ў працы саветаў, кааперацыі, камітэтах сялянскае ўзаемадапамогі і г. д., асабліва з пункту гледжаньня правільнага правядзеньня клясавае лініі ў іх працы; 2) праца груп беднаты ў галіне разгортваньня калгаснага будаўніцтва і правядзеньня масавых савецкіх мерапрыёмстваў у справе ўздыму сельскай гаспадаркі; 3) удзел груп беднаты ў культурным будаўніцтве (масавая культасьветпраца, школьнае будаўніцтва, сельска-гаспадарчая асьвета і г. д.); 4) значэньне груп беднаты ў справе разгортваньня самакрытыкі, чысткі апарату ад клясава-варожых і гнілых элемэнтаў, палепшаньня працы сэкцыі саветаў і г. д.; 5) роля груп беднаты па вылучэньні актывістаў з батракоў, беднаты і сярэднякоў у дзяржаўны апарат і ўцягваньне беднаты ў савецкую працу; 6) праца партарганізацый па згуртаваньні беднаты і кіраўніцтве штодзённай іх двейнасьцю, а таксама ўдзел камсамолу ў гэтай працы.

Правядзеньне агляду груп беднаты і канфэрэнцый гэтых груп павінна спрыяць рашучаму палепшаньню ўсяе працы на вёсцы і асабліва ўзмацненьню кіраўніцтва партыі ў надыходзячых перавыбарах саветаў.

Сэкратар ЦК УсеКП(б) *Молатаў.*
Заг. аддз. па працы на вёсцы *Баўман.*

ФАШЫСЦКІ РАЗГУЛ У ВЭНГРЫІ.

ВЕНА, 24-X. Як паведамляюць з Будапэшту, другі дзень адбываюцца бясчынствы фашыстаў. Увечары некалькі сот фашысцкіх студэнтаў справавалі ўчыніць наскок на выдавецтва лібэральнае вячэрняе газэты «Аз Эшт» і на рабочы кніжны гандаль, які знаходзіцца недалёка ад выдавецтва.

Групы рабочых у розных райёнах гораду наладзілі дэманстрацыі проці фашызму, за волю сходаў і друку. Рабочыя зьбілі фашыстаў, якія трымалі сеўя правакацыйна. Паліцыя арыштавала шмат якіх рабочых і засудзіла іх у адміністрацыйным парадку да буйных грашовых штрафаў і шматдзённых арыштаў.

РАЗГОН АРГАНІЗАЦЫІ РАБОЧАЕ АБАРОНЫ.

ВЕНА, 24-X. Як паведамляюць з Будапэшту, вэнгерскі міністр унутраных спраў Сцытоўскі распусьціў арганізацыю рабочае абароны, якая ахоўвала памяшканьні цэнтральнага камітэту сацыял-дэмакратычнае партыі і прафсаюзаў.

Капітал куе ланцугі для працоўных СССР.

Франка-польска-румынскі антысавецкі блёк.

Плян аб'яднаньня польска-румынскага войска пры абвяшчэньні вайны проці СССР.—За плячыма згаворшчыкаў стаіць Англія.

БЭРЛІН, 23-X. Нацыяналісцкія газэты вымясьцілі паведамленьне агэнцтва Ост-Экспрэс в Прагі аб новых падрабязнасьцях дзейнасьці французскіх, польскіх і румынскіх вайсковых і палітычных дзеячоў, накіраванае да заснаваньня антысавецкага фронту. Водгук гэтага паведамленьня, на канфэрэнцыі ў Варшаве, пра якую да гэтага часу нічога ня было відома і ў якой удзель нічалі галоўны інспэктар румынскае арміі Мадарэску і начальнік польскага генэральнага штабу Пістор, распрацоўваўся апэрацыйны плян польскага і румынскага войска на выпадак вайны проці Савецкага Саюзу. Згода была дасягнута па пытаньнях разьмеркаваньня ролі ў вярхоўным камандаваньні над адзіным фронтам польскага і румынскага войска. Сэрпрэчнасьці выявіліся ў пытаньні аб тым, якое трымацца стратэгіі: наступаючага ці абарончага характару. Польшча выказалася за наступаючую, а Румынія—за абарончую.

У выніку візыту Пілсудзкага ў Бухарэст (пасьля гэтае нарады) плян апэрацый проці Савецкага Саюзу скончан. Польшча дала завяроньні, што яна ўключыць у румынскую армію тры дывізіі. Пілсудзкі ўжываў усе заходы, каб Румынія далучылася да праекту заснаваньня украінскае буфэрнае дзяржавы пад польскім уплывам між Савецкім Саюзам і Румыніяй. Пры гэтым Пілсудзкі падаваў надзею абярнуць Адэсу ў вольны порт для Румыніі.

Спроба Пілсудзкага дамагчыся пагоджанасьці між Румыніяй і Вэнгрыяй—не ўдалася.

Ва ўсіх гэтых перамовах вялікую ролю адыгрывала актыўная дапамога з боку Францыі, якая заявіла аб сваёй гатоўнасьці дастаўляць Румыніі і Польшчы вайсковыя прылады, прысылаць афіцэраў гэнэральнага штабу, а пры патрэбе і французкае войска.

Бэнеш, па якога таксама быў зроблен нажым з боку Англіі і Францыі, каб прыцягнуць і Чэхаславакію да ўдзелу ў антысавецкім фронце, высунуў у якасьці адмовы такія моманты: радыкальныя прыпісьцельскія да СССР плыні сярод чэхаславацкіх рабочых і адсутнасьць сурёзных непаразуменьняў між Чэхаславакіяй і СССР. У часе апошняга свайго падарожжа ў Парыж і Лёндан Бэнеш быў больш лагодным і выказаў згоду на пастаўку амуніцыі для Румыніі.

РУМЫНІЯ ЎЗМАЦОЎВАЕ СТРАТЭГІЧНЫЯ ПУНКТЫ НА МЕЖАХ З СССР.

ВЕНА, 24-X. Як паведамляюць з Бухарэсту, румынскі міністр шляхоў Думітрыў у гутарцы з прадстаўнікамі друку пацьвердзіў паведамленьне аб надыходзячай у бліжэйшым часе перабудове аднакалейнае чыгункі Чарнавіцы—Марасошлі ў двухкалейную.

Румынскія палітычныя колы гэтую працу ставяць у сувязь з намечаным польска-румынскім умацаваньнем узьбярэжжа Чорнага мора, якое мяркуецца правесьці, каб «на выпадак вайны перашкодзіць высадцы савецкае арміі».

ФРАНЦЫЯ ЎЦЯГНУТА Ў КОЛА АНГЕЛЬСКІХ ПЛЯНАЎ.

РЫМ. Лёндансці карэспандэнт газэты «Трыбуна» падае шэраг довадаў, што між Англіяй і Францыяй існуе шырокая палітычная згода, такая-ж, як перад сусьветнаю вайною. Улетку 1927 году між Англіяй і Францыяй дасягнута згода аб эканамічным супрацоўніцтве ў калёніях. Зараз ангельскі погляд на віленскае пытаньне поўнасьцю супадае в французкім. Сёлета ў студзені між ангельскімі і польскімі вугленрамыслоўцамі праводзілася сапраўдная вайна. Цяпер яны заснoўваюць сындыкат. У Варшаве, апроч таго, заснаваны экспортны банк пры буйным удзеле ангельскага капіталу. Англія і Францыя супольна выступілі ў Сафіі па пытаньні паконт македонскіх рэвалюцыянэраў. Англія магла далучыцца да пакту Келёга безагаворачна, бо заснаваньне англа-амэрыканскага супрацоўніцтва важна для Англіі, каб узмацніць сувязь між некаторымі дамініёнамі, якія амэрыканізуюцца; аднак, пасьля перамоў Чэмбэрлена з Брыянам, Англія згазілася на агаворкі Францыі. Пазіцыі Англіі і Францыі ў пытаньні аб эвакуацыі Рэйнскае вобласьці таксама супадаюць.

Сумныя вынікі лодзінскае здрады.

Умовы капітуляцыі ажабрачваюць тэкстыльшчыкаў.—Фабрыканты масамі звальняюць удзельнікаў стачкі.

Барацьба гатова выбухнуць з новаю сілаю.

ВАРШАВА, 24-X. Не зважаючы на афіцыйнае спыненьне забастоўкі ў Лодзі, забастоўка цалкам яшчэ не ліквідавана. Пра настрой рабочых выразна сьведчыць той факт, што ў павядзелак, не зважаючы на пастанову прафсаюзаў, аднавіла працу толькі 10 проц. рабочых.

Учора на некаторых прадпрыёмствах праца не праводзілася. На Відзеўскай мануфактуры зноў афіцыйна абвешчана забастоўка, бо адміністрацыя адмовілася даць рабочым нават тую 5-ці-процантную прыбаўку да заработку, якая была абяцана прафсаюзам пры ліквідацыі забастоўкі.

Эпідэмічныя і кадэкаўскія жоўтыя прафсаюзы, над нажымам аб'яднаных імі мас, адмаўляюцца зацьвердзіць новы калектыўны ўгавор. Яны агаласілі адозву да рабочых, у якой высоўваюць рад новых патрабаваньняў і дамагаюцца склікаць канфэрэнцыю з прадстаўнікамі прадпрыёмцаў для перагляду калектыўнага ўгавору.

Сярод сяброў лодзінскага прафсаюзу тэкстыльшчыкаў нагадваецца хваляваньне. Значная частка рабочых патрабуе скасаваць калектыўны ўгавор і прадоўжыць забастоўку.

Учора ў памяшканьне лодзінскага муніцыпалітэту прыехаў пракурор з паліцэйскім камісарам. Як думаюць, іх прыезд зьвязан з далучэньнем рабочых лодзінскага муніцыпалітэту да ўсеагульнае забастоўкі. Як відаць, улада рыхтуе рэпрэсіі проці рабочых і служачых лодзінскага муніцыпалітэту. Характэрна, што сёньня агалошана заява старшыні лодзінскага муніцыпалітэту Зяменскага, які востра ганьбіць рабочых муніцыпалітэту за ўдзел ва ўсеагульнай забастоўцы.

Не зважаючы на абяцаньні прадпрыёмцаў узяць на працу ўсіх баставаўшых, адміністрацыя шмат-якіх фабрык адмовілася дапусьціць да працы рабочых, якія бралі актыўны ўдзел у кіраўніцтве забастоўкаю. Сярод бастуючых узрушэньне.

Як яны пралі рабочых.

ВАРШАВА, 25-X. Як вядома, адным з спосабаў, пры дапамозе лкіх пэнэсаўцам удалося сарваць забастоўку, зьяўляецца тое, што пэнэсаўцы, сабатуючы пастанову забастовачнага камітэту і нарады фабрычных дэлегатаў, ня склікалі нарады прадстаўнікоў прадпрыёмстваў і не паставілі на абмеркаваньне мас пытаньня аб далейшай забастовачнай тактыцы.

Гэты сход пэнэсаўцы склікалі толькі ўчора. Сход быў вельмі бурны. Некаторыя дэлегаты выказаліся, каб прадоўжыць забастоўку і скасаваць калектыўны ўгавор. Кіраваўшыя сходам пэнэсаўцы не дапусьцілі ўхвалы рэзалюцыі, якая была прапанавана левымі рабочымі і патрабавала прадоўжыць забастоўку.

ВОДЛУГ ЗАГАДАЎ РЭФАРМІСЦКАГА ЦЭНТРУ...

ВАРШАВА, 24-X. Як цяпер выяўляецца, усеагульная забастоўка ліквідавана пры энэргічным удзеле цэнтральнае камісіі прафсаюзаў, якою кіруюць пэнэсаўцы. Усе захады да ліквідацыі забастоўкі былі ўжыты згодна яе загадаў. Камісія дзейнічала такім парадкам затым, што баялася, каб усеагульная забастоўка ў Лодзі не абярнулася ва ўсеагульную забастоўку ва ўсёй Польшчы.

Другою прычынаю, якая прымусіла пэнэсаўцаў і іх цэнтральную камісію прафсаюзаў рыхтаваць зрыў забастоўкі, быў раскол у ППС і спаборніцтва абедзьвюх фракцый у выслужніцтве перад урадам.

СТАЧКА ЎЗМАЦНІЛА ЎПЛЫЎ КАМПАРТЫІ.

НАВАТ БУРЖУАЗНАЯ ПРЭСА ПРЫЗНАЕ ГЭТА.

ВАРШАВА, 24-X. «Рэч Посполіта» піша, што прафсаюз тэкстыльшчыкаў «зрабіў вялічэзную памылку, дапусьціўшы разьвіцьцё забастоўкі». Газэта зазначае, што ў выніку гэтае памылкі значна ўзмацніўся ўплыў камуністаў у рабочых масах.

Проці пана ў Заходняй Украіне.

ВАРШАВА, 23-X. Газэты паведамляюць, што на вакзале ў Станіслававе тры невядомыя асобы зьбілі дэпутата сельробу Хама. У апошні час буржуазны друк праводзіў проці Хама шалёную кампанію, абвінавачваючы яго ў кіраўніцтве сельска-гаспадарчымі рабочымі, якія забаставалі ў майнтку Сапегі—Хлябоннае. З прычыны таго, што Сапега ўзяў на працу штрайкбрэхераў, здарыліся стычкі між штрайкбрэхерамі і рабочымі. Апроч таго, здарыліся такоама стычкі між рабочымі і паліцыяй.

Збойства камуністычнага дэпутата тав. Росяка.

ВАРШАВА, 23-X. У надзелю ў часе разгону рабочай масы, якая сабралася наўкол камуністычнага дэпутата Росяка, апошні быў зьбіт ударам шаблі. Удар, нанесены плашмя, быў аднак настолькі моцны, што Росяк страціў прытомнасьць. Удар быў нанесены Росяку конным паліцэйскім, які зараз-жа схаваўся. Рабочыя ачунялі Росяка і адвезьлі да хаты.

Крывавыя дэманстрацыі пратэстаў.

ВАРШАВА, 24-X. У Рудзе Пабяніцкай адбылася дэманстрацыя пратэсту проці новага калектыўнага ўгавору і проці звальненьня адміністрацыяй кіраўніцкоў забастоўкі. Паліцыя наскочыла на дэманстрантаў і начала іх зьбіваць. Тады дэманстранты перарэзалі электрычныя правады, каб абараніць сябе ад наскоку паліцыі. Упацемках здарылася бойка, у выніку якое налічваецца некалькі параненых. Урэшце паліцыя разагнала дэманстрантаў.

У другім тэкстыльным цэнтры—Азаркаве—дэманстранты рушыліся да памяшканьня муніцыпалітэту. Муніцыпальная ўлада выкінула паліцыю, якая насочыла на дэманстрантаў. Рабочыя адбіваліся. Паранена 10 рабочых. Паранена таксама 7 паліцэйскіх, у тым ліку начальнік паэркоўскае паліцыі.

У ЗАХОДНЯЙ БЕЛАРУСІ.

Прысуд над камуністам.

Акруговы суд у Беластоку прыгаварыў Юрага Шагуна, быццам члена ЦК КПЗБеларусі і акруговага сэкратара камітэту тэйка партыі ў Беластоку на 8 гадоў катаржнага астрогу.

Выпушчаны на волю.

Гэтымі днямі выйшаў з віленскага астрогу Пятро Шаўлюк, які адбываў кару за „праступкі" ў часе існаваньня Грамады. Да суду прасядзеў ён 11 месяцаў і пасьля суду—19. У часе галадоўкі яго моцна «частавалі» крывавымі збойствамі.

Чыгуначная катастрофа ў Слоніме.

Гэтымі днямі на ст. Слонім здарылася чыгуначная катастрофа. Па невысьветленай прычыне асабовы поезд, які ішоў з Варшавы, наскаў на іншы, які стаяў на стацыі, з прычыны чаго некалькі пасажырскіх вагонаў разьбіта.

РАБОЧЫЯ НЕ ДАЛІ АРЫШТАВАЦЬ ТАВ. ГАЎРОНЯ.

ВАРШАВА, 23-X. На камуністычнага дэпутата Гаўроня, які прыехаў у Дамброўскі райён на мітынг, учыніла наскок паліцыя. Рабочыя, аднак, адбілі Гаўроня. На чале групы паліцэйскіх, якія спрабавалі арыштаваць Гаўроня, быў аналодачны нагледчык Ялынь, ранейшы пэнэсавец.

У ЛІТВЕ.

500-я гадавіна сьмерці Вітаўта.

Літоўскі ўрад пастанавіў урачыста сьвяткаваць у лістападзе г.г. 500-ую гадавіну сьмерці вялікага князя літоўскага Вітаўта. Дзень гэты будзе вельмі ўрачыста сьвяткавацца ў Літве.

Коўня—Клайпэда.

У часе нядаўнага свайго пабыту ў Клайпэдзкім краі Вальдэмарас сказаў на банкоце прамову, у якой заявачыў, што літоўскі ўрад прыложыць усякія стараньні, каб у бліжэйшым часе злучыць Клайпэду годнай дарогай з „часовай сталіцай" Літвы—Коўняй.

Літоўскі „Цэппэлін".

„Дзеньнік Віл." (№ 241) паведамляе, што літоўскі ўрад заказаў у механічных варштатах пад Вадэнскім возерам „Цэппэлін" сярэдні вялічыні. Быццам з-за гэтага міністр краёвай абароны Даўкантас, які быў проці заказу, падаў у адстаўку.

Партыя і перавыбары саветаў.

Сіла саюзу пралетарыяту з асноўнымі гушчамі сялянства пераважае над сілаю хістаньня.

Прамова т. Кагановіча на усесаюзнай нарадзе па перавыбарах у саветы).*

Клясавая барацьба і выбары.

У нас, у краі Саветаў, апрача камуністычнае, іншых палітычных партый няма. У нас не парляманцкая палітычная дэмакратыя.

У некаторых таварышоў можа ўзьнікнуць пытаньне: навошта разьдзьмуваць палітычнае значэньне выбарчае кампаніі? Закон ёсьць, асабліва барацьбы ня будзе, правядзём яе спакойна апаратным шляхам. Такая пастаноўка пытаньня чыста бюракратычная і самая шкодная пастаноўка. У нас палітычных партый няма, але ёсьць клясы. Палітычныя настроі асобных клясаў, якія ёсьць у нашым краі, зрэзумела, будуць праяўляцца ў час выбараў. Мы ў апошнія гады маем бязумоўнае абвастрэньне клясавае барацьбы. Побач з ростам сацыялістычнае гаспадаркі, колькаснага і якаснага росту пралетарыяту мы маем і рост ыфэрэнцыяцыі ў вёсцы, рост варожых нам клясаў (кулака, непмана). Супрэчнасьці абвастраюцца, рост пралетарыяту і сацыялістычнае гаспадаркі ня толькі не паслабляе супраціўленьня кулака, але робіць яго больш злосным, узмацняе яго наступ, абвастрае клясавую барацьбу. У даны момант, хацелі-б мы гэтага, ці не хацелі, але мы маем бясспрэчнае абвастрэньне клясавае барацьбы.

У горадзе пралетарыяту процінастаўлены непманы і частка буржуазнае інтэлігенцыі, якая ідзе зараз з непманамі і якая ва ўслякім выпадку будзе бурчэць разам з імі.

У вёсцы мы маем сельскі пралетарыят, батрацтва, нашую апору на сяле—беднату, нашага саюзьніка—сярэдняка, які, між іншым, зусім не пазбаўлен тых ці іншых хістаньняў. Але мы маем таксама ў ёй разлаванага так сказаць, «да чорцікаў» клясавага ворага—кулака, спэкулянта, міраеда, які жорстка супраціўляецца і будзе супраціўляцца ўсім нашым мерапрыёмствам. Мы павінны правесьці выбарчую кампанію такім парадкам, каб узмацніць, умацаваць нашы палітычныя пазіцыі: павінны здолець палітычна выкрыць тыя клясы і групы якія зьяўляюцца крыніцаю правае небясьпекі пры выбарах і якія будуць выступаць у тэй ці іншай форме супроць нас.

Клясавая барацьба праводзіцца па лініі барацьбы паміж кулаком, з аднаго боку і беднатою, батраком—з другога. Клясавая барацьба вядзецца пралетарыятам у асобе пралетарскае дзяржавы з кулаком, непманам. Гэтая барацьба ідзе, галоўным парадкам па лініі барацьбы са спэкуляцыяй сельска-гаспадарчымі таварамі, па лініі цэн, па лініі падатку, бо кулак імкнецца вызваліцца ад асноўнага цяжару падатку, які на яго ўскладаем і г. д. Вядомыя супярэчнасьці (хоць не асноўныя) ёсьць паміж пралетарыятам і сярэдняком—супрэчнасьці не асноўныя бо асноўная лінія пралетарыяту, гэта—барацьба за капіталістычны шлях разьвіцьця нашага краю, узмацненьне сацыялістычных форм нашага разьвіцьця. Зварот да капіталізму ў нашым краі быў-бы жорсткім ударам па сярэдняку. З гэтага пункту гледжаньня ў нас ёсьць моцныя асновы для саюзу з сярэдняком. Саюз з сярэдняком непарушны, але супярэчнасьці часовыя ёсьць.

Пралетарыят вядзе зараз рашучы курс на індустрыялізацыю краю. Без індустрыялізацыі краю, без разьвіцьця вырабу сродкаў вытворчасьці, без разьвіцьця цяжкае індустрыі наш край ня можа ўтрымацца на шляхах сацыялістычнага будаўніцтва, без усяго гэтага сусьветны капіталізм акажацца мацней за нас. Сялянства—асноўная маса—зацікаўлена ў тым-жа, наколькі яна зацікаўлена ў некапіталістычным шляху нашага разьвіцьця, у посьпехах і перамозе сацыялізму ў нашым краі. Але ёсьць супярэчнасьці бягучыя: б'е, напрыклад, па сярэдняку некаторы цяжар падатку, б'е, напрыклад, на лініі цэн: ня зараз ня можам даць за хлеб цану, якан-б адзявядала цане на прамысловыя тавары, бо гэта прывяло-б да поўнага падрыву нашае прамысловасьці, а значыць, у канцы-канцоў іншо-б супроць сярэдняка. Сярэдняк іменна па гэтых пытаньнях паддаецца часамі ўплыву кулака, выяўляе нездаволеньне. Больш таго, такому ўплыву паддаюцца часамі паасобныя таварышы ў радах нашае партыі.

Гэтым настроям мы павінны даць самы рашучы адпор. Уступкі сярэдняку магчымы, часамі патрэбны, але мы ніколі ня зможам ісьці на такія ўступкі, якія азначалі-б караныя падрыў нашае індустрыі, якія былі-б на руку замежнаму капіталу, на руку ўнутранаму капіталу, на руку кулака, які ненавідзіць савецкую ўладу і ўвесь цяперашні лад. На такія ўступкі мы ісьці ня можам, а, значыць, відомыя цяжкасьці ў адносінах паміж намі і сярэдняком няўхільны, але гэтыя цяжкасьці будуць зьпішчаны.

Палітыка нашае партыі накіравана як раз на тое, каб асноўную масу сялянства,—сярэдняка—не адпіхнуць ад пралетарыяту на бок кулака, які ўсяляк прабуе перацягнуць яго на свой бок. Кулакоў падтрымлівае вызначная верхавінка сярэдняку, настрой якіх няўстойлівы. Але калі паставіць пытаньне аб усім сярэднім сялянстве, аб яго адносінах да партыі, дык павінен сказаць, што ня толькі няма разьмычкі, аб якой гаварылі некаторыя таварышы, ня толькі няма разрыву паміж пралетарыятам і асноўнай масай сялянства, але зараз ёсьць поўнае палепшаньне настрою сярэдняка за партыю, за пралетарыят, за савецкую ўладу. Асабліва яскравым паказчыкам гэтага зьяўляецца пасьпешны ход нашых хлебазагатовак за апошні пэрыяд. Зразумела, калі мы прымушаны былі ў інтэрэсах пралетарскае дзяржавы моцна ўдарыць па кулаку, дык сярэдняк захістаўся, бо мы трошкі закранулі яго бягучыя інтэрэсы, але яго карэнныя клясавыя інтэрэсы, сувязь з пралетарыятам, аказаліся значна мацнейшымі за гэтае яго часовае хістаньне. На розных этапах нашага разьвіцьця мы мелі і маем хістаньні ў сярэднім сялянстве, але **сіла саюзу пралетарыяту з сялянствам пераважнае над сілай хістаньня.**

Мы зараз маем цяжкасьці вельмі вялікія. Гэтыя цяжкасьці зьвязаны з тым, што побач з ростам індустрыі ў нас ніякі ўзровень сельскае гаспадаркі. Павышэньне гэтага ўзроўню, чаго-б гэта ні каштавала, мы ставім сваёй асноўнай задачай. Цяжкасьці ўскладняюцца шмат якімі навымі глюстравамі, скажэньнямі, памылкамі. На падставе гэтага ў некаторых таварышоў складаецца ўражаньне, што становішча ў нас настолькі цяжкае, што роўнага яму ня было за ўсе гады непу. Нельга параўноўваць цяперашняе становішча са становішчам 1924 году. Зразумела, хістаньні ў сялянстве адбіваюцца на настроях асобных груп пралетарыяту, нават асобных членаў нашае партыі, якія ў ацэнцы палітычнага становішча няправільна ўяўляюць суадносіны клясавых сіл у краіне. Фактычнае-ж становішча справы дае нам поўнае права сьцьвярджаць, што для такое ацэнкі няма ніякіх падстаў.

Нашы задачы і лёзунгі.

Пры выбарах выяўляцца клясавая барацьба больш востра. Не зважаючы на тое, што нашыя клясавыя ворагі назбаўлены выбарчых правоў, яны сваю актыўнасьць будуць выяўляць і ўзмацняць на меры ўзмацненьня нашага наступу на іх. У нас будуць цяжкасьці пры перавыбарах саветаў ня толькі ў вёсцы, але і ў горадзе. Нельга было-б дараваць, калі-б зьвесьці ўсю справу да таго, што ўсякае нездаволеньне ідзе ад кулака. Правы элемэнтаў нездаволенасьці будуць і сярод сярэдняцкіх гушчаў. Перабольшваць гэтую нездаволенасьць ня трэба, трэба бачыць яе зус

Клясавая барацьба ў Нямеччыне.

230.000 МЭТАЛЁЎЦАЎ ПЕРАД ЛЁКАУТАМ

БЭРЛІН, 24-Х. Саюз прадпрыёмцаў Рэйнска-Вэстфальскае мэталёвае прамысловасьці прапануе сваім сябрам правесьці лёкаут 230-ці тысяч рабочых, назначаны на 1-га лістапада.

Барацьба ў Мюнхен-Глядбасе сарвана.

ПРОЦІ ВОЛІ ТЭКСТЫЛЬШЧЫКАЎ ПРАФСАЮЗЫ ЗГАДЗІЛІСЯ НА ТРАЦЕЙСКУЮ ПАСТАНОВУ.—МАГУТНАЯ ДЭМАНСТРАЦЫЯ БАСТУЮЧЫХ

БЭРЛІН, 23-Х. Прафсаюзы згадзіліся на трацейскую пастанову аб канфлікце ў тэкстыльнай прамысловасьці Мюнхен-Глядбаху. Пастанова арбітражнае інстанцыі прадугледжвае павялічэньне заработку на 5 проц. замест 15-ці, якіх дамагаліся рабочыя.

Пераважаючая большасьць тэкстыльных рабочых не згаджаецца на пастанову прафсаюзаў, бо яна надоўга замацуе сучасны мізкі заработак. Пленум фабрычных камітэтаў тэкстыльных фабрык Мюнхен-Глядбасу рашуча адхіліў трацейскую пастанову. Старшыня сходу, сацыял-дэмакрат, не дазволіў галасаваць за прапанову левае прафсаюзнае меншасьці, якая патрабавала, каб на выпадак абвяшчэньня трацейскае пастановы абавязковаю была арганізавана далейшая барацьба пад кіраўніцтвам камітэту, абранага агульна-заводзкімі сходамі.

У далейшым старшыня выклікаў паліцэйскую каманду і пад пячуваньня выгукі ўдзельнікаў сходу прапанаваў паліцыі вывесьці з залі пасяджэньня некалькіх дзеячоў левае прафсаюзнае меншасьці.

У канцы пасяджэньня перад памяшканьнем, дзе адбываўся сход, прайшла вялізнная дэманстрацыя бастуючых тэкстыльных рабочых, наладжаная кампартыяй. Як прызнае друк, гэтая дэманстрацыя зьяўляецца самаю вялікаю з усіх, якія былі калі-небудзь у Мюнхен-Глядбасе за апошнія гады. Дэманстранты патрабавалі адхіліць трацейскую пастанову і прадоўжыць барацьбу, калі пастанова будзе абвешчана абавязковаю. Паліцыя ачапіла памяшканьне, дзе здывалася пасяджэньне і разагнала дэманстрантаў. Настрой тэкстыльных рабочых Мюнхен - Глядбаху надзвычайна ўзрушаны.

У Саюзе ССР.

ЛІЧБОВЫ І САЦЫЯЛЬНЫ СКЛАД ПАРТЫІ.

МАСКВА, 25-Х. Водлуг даных статыстычнага аддзелу ЦК УсеКП(б), на 1-га студзеня 1928 году партыя мела ў сваіх шэрагах 1.304.471 камуністаў, на 1-га ліпеня колькасны склад яе павялічыўся да 1.418.060 камуністаў. Такім парадкам партыя за паўгода павялічыла свае шэрагі на 113.589 чалавек або на 8,7 проц.

Накольki зьлінімі зьяўляюцца дасягненьні ў палепшаньні сацыяльнага складу партыі, сьведчаць такія даныя: на 1-га студзеня 1927 году ў партыі было 740.731 рабочы (56,8 проц.), 229.091 селян (22,9 проц.) і 264,649 служачых і інш. (20,3 проц.); на 1-га ліпеня 1928 г. адбыліся такія зьмены: лік рабочых павялічыўся да 848,764 (59,9 проц.), селян—309.492 (21,8 проц.), а служачых і інш. зьменшыўся да 259.804 (18,3 проц.). Такім парадкам павялічэньне ўдзельнае вагі рабочых з вытворчасьці за мінулых паўгода наўпоўны і здарылася гэта, пераважна, за лік зьмяншэньня ўдзельнае вагі групы служачых. У той час, як удзельная вага селянскае групы засталася амаль-што бяз зьмены, лік батракоў у партыі павялічыўся.

АГЛЯД ПРАЦЫ ГРУП БЕДНАТЫ Ў ДРУКУ.

МАСКВА, 23-Х. Каб забясьпечыць больш актыўны ўдзел беднаты ў перавыбарах саветаў, ЦК прызнаў патрэбным наладзіць у працягу лістапада—сьнежня ў газэтах «Беднота», «Крестьянская газета», часопісі «Кресть янка» і па ўсіх мясцовых абласных, акруговых, губэрскіх і павятовых селянскіх газэтах, а таксама на ўсёй сетцы вясковых сьцэнгазэт, агляд працы груп беднаты. Кіраўніцтва аглядам ускладзена на ЦК.

Мясцовым партыйным арганізацыям ЦК прапанаваў склікаць перад выбарамі ў саветы (лістапад—сьнежань) валасныя, раённыя, павятовыя і акруговыя канфэрэнцыі груп беднаты, з пастаноўкаю на шырокае абмеркаваньне пытаньня аб перавыбарах саветаў.

60 год працы прафэсара-рэвалюцыянэра

МАСКВА. Камітэт па адзначэньні навуковае і палітычнае дзейнасьці т. праф. М. Мік. Пакроўскага адзначае 60-цігодзьдзе Пакроўскага ўрачыстымі пасяджэньнямі ў вышэйшых навучальных установах, камуністычных вышэйшых навучальных установах, на рабочых факультэтах і ў навукова-дасьледчых установах. Ва ўшанаваньні юбіляра бяруць актыўны ўдзел шырокія колы пралетарскага студэнцтва.

Першае ўрачыстае пасяджэньне адбылося ўжо ў камуністычным унівэрсітэце нацыянальных меншасьцяў Захаду.

Загатоўкі растуць.

МАСКВА, 25-Х. Водлуг даных Цэнтрасаюзу, хлебазагатоўкі хлебнае каапэрацыі за 4-ю пяцідзёўку склалі 106.013 тон проці 102.810 тон у трэцюю пяцідзёўку. За 20 дзён кастрычніка спажывецкая каапэрацыя загатовіла 408.281 тону, г. зн. 97,2 пр. месячнага пляну.

ВЕСТКІ АДУСЮЛЬ.

НЯМЕЧЧЫНА АДКЛІКАЛА З ВАРШАВЫ СВАЮ ДЭЛЕГАЦЫЮ.

БЭРЛІН, 20-Х. Нямецкая дэлегацыя, якая ўдзельнічала ў польска-нямецкіх гандлёвых перамовах у Варшаве, атрымала ад нямецкага ўраду ліст, каб вярнуцца ў Бэрлін. Поўафіцыйна Нямеччына зазначае, што гэты крок ня трэба лічыць разрывам перамоў.

Нямецкі друк, абяркоўваючы перарыў перамоў, ізноў падкрэсьлівае, што ў няўдачы перамоў вінавата Іменца Польшча, якая высунула новыя патрабаваньні.

Памёр праф. Оляр.

ПАРЫЖ, 23-Х. Памёр вядомы гісторык францускае рэвалюцыі прафэсар Оляр.

ЧЫМ ПРЫКРЫВАЮЦЬ БАНКІРЫ ПАРУШЭНЬНЕ РАПАЛЬСКАЕ ЗГОДЫ.

БЭРЛІН, 23-Х. Орган цяжкае прамысловасьці „Рэйніш Вэстфалішэ Цэйтуг" прысьвечвае артыкул пастанове нямецкіх банкаў узяць удзел у «міжнародным аб'яднаньні крэдыторaў Расеі». Газэта заўважае, што «прыватныя нямецкія ўстановы не абавязаны вечна прызнаваць адмову нямецкага ўраду ад даваенных выплат, згодна Рапальскага ўгавору".

„Нават і Рапальскі ўгавор,—піша газэта,—мае агаворку, згодна якое ў той момант, калі Расея прызнае даваенныя патрабаваньні іншых дзяржаў, дык адначасна ізноў адраджаюцца і нямецкія патрабаваньні. З гэтае прычыны ўдзел зацікаўленых колаў у лёндонскай канфэрэнцыі даваенных крэдыторaў Расеі зьяўляецца ня толькі зусім лёйльным у адносінах да расейцаў, але нават і пажаданым".

Да будаваньня Беларускай Акадэміі Навук.

Шыбкі ўзрост беларускага культурнага будаўніцтва ў рэвалюцыйную эпоху завяршыўся гістарычнай пастановай урадаў БССР і СССР аб утварэньні Беларускай Акадэміі Навук. Падзеі адна аднае важнейшыя адбываюцца ў Савецкай Беларусі ў апошнія гады. На дзікім аршанскім балоце канчаюць пабудову электрычнага волата—Асінстану; менш як за год над сеткай глухіх менскіх завулкаў падналіся вялізныя муры Беларускага Унівэрсытэту, а сёньня мы ўжо напярэдадні ня менш грандыёзнага па свайму значэньню будаваньня Беларускай Акадэміі Навук. Усё гэта дзеецца ў Беларусі, якая ў працягу некалькі вякоў служыла для сваіх суседзяў прыкладам адсталасьці і заняпаду. Калі народ, уся інтэлігэнцыя якога да нядаўняга часу складалася з нялічнага вясковага настаўніцтва, на працягу 10 год рэвалюцыі змог дарасьці да Акадэміі Навук, дык гэты тэмп росту годны сацыялістычнае дзяржавы.

Значэньне ўсіх гэтых падзей асабліва адцяняецца палажэньнем у Заходняй Беларусі. Цяжка ўявіць сабе большую кантрастнасьць умоў палітычнага і культурнага жыцьця, чым тыя, што ўтварыліся паабапал рыскае мяжы. Там, на захадзе, закрываюць апошнюю беларускую вясковую школку, для адкрыцьця якое столькі самаахвярных высілкаў страціла вакольнае сялянства,—тут волею пралетарскае дзяржавы створана Беларуская Акадэмія Навук; там для беларускіх вучоных знаходзіцца месца толькі ў вастрожных мурох Лукішак і Вронак, тут будуюцца новыя гмахі для Акадэміі, Унівэрсытэту. Бязьлюдныя і бяжыцьцёвыя заміраюць гарады Заходняе Беларусі, і ў той самы час савецкі Менск будуецца з такім тэмпам і размахам, як будаваліся ў свой час сталіцы наймагутнейшых дзяржаў.

Будаўніцтва Беларускае Акадэміі Навук мае, аднак, ня толькі гэтае палітычнае значэньне. Першая ад пачатку да канца створаная пралетарскай дзяржавай Акадэмія Навук, якой будзе Беларуская Акадэмія, будзе займаць дужа віднае месца ўва ўсім працэсе сацыялістычнага будаўніцтва. Яна бязумоўна будзе сапраўднай цытадэллю матар'ялістычнага сьветапогляду і кузьняй марксысцкага метаду ў навуцы. Самы-ж зьмест яе працы павінен будзе ў як найбольшай меры адпавядаць патрэбам сацыялістычнага будаўніцтва. Патрэбы гэтыя вымагаюць шырокае нав.-дасьледчае працы з ужываньнем найбольш дасканалых мэтадаў і навейшых дасягненьняў навукі як у галінах гуманітарных навук, так асабліва ў навуках дакладных, у прыродазнаўстве, тэхніцы і эканоміцы.

Апошнія галіны не маглі быць разгорнуты Інбелкультам у такой меры, як гэта зможа зрабіць Акадэмія; ужо сама назва Інбелкульту часамі абуджала сумляваньні, ці павінен ён займацца пытаньнямі, якія непасрэдна да беларускай культуры не адносяцца. Тым часам жыцьцё ставіла свае вымаганьні і ў Інбелкульце даволі шырока разгортваецца вывучэньне прыроды і гаспадаркі Беларусі. Яшчэ шырэйшай павінна быць гэтая частка працы ў Акадэміі, бо нават у буржуазных акадэміях навукі што ўжываюць дакладныя мэтады, займаюць найвіднейшае месца.

У новых і перадавых акадэміях сьвету ўсё больш увагі пачынаюць аддаваць і прыкладным тэхнічным навукам. Па гэтаму шляху з самага пачатку пайшла Украінская Акадэмія, а з прыняцьцем новага статуту—на яго-ж уступае і Ўсесаюзная Акадэмія. Вялізная важнасьць гэтых галін веды асабліва ў часе тэхнічнае рэканструкцыі народнае гаспадаркі дазваляюць думаць, што і пры будаваньні Беларускай Акадэміі на іх будзе зьвернута асаблівая ўвага. Тэхнічная адсталасьць нашае народнае гаспадаркі асабліва вялікая, асабліва неадпаведная нашаму геаграфічнаму палажэньню на мяжы Заходняй Эўропы, на мяжы сацыялістычнага і буржуазнага сьвету. Каб зьліквідаваць гэтую адсталасьць, трэба зрабіць аграмадныя высілкі ня толькі за сваё пакаленьне, але і за шэраг адыйшоўшых у нябыцьцё, якія мелі зьвязаныя рукі і моўчкі мусілі наглядаць заняпад Беларусі. Шляхам узмоцненай навукова-дасьледчай працы, павышэньнем культурнага ўзроўню і грамадзкай самадзейнасьці мас, узмоцненых капітальных укладаньняў у буйную гаспадарку—мы зможам дабіцца і ўраджаю нямецкага і нямецкае вытворчасьці працы. У выкананьні гэтых задач шмат павінна дапамагчы Акадэмія Навук сваёю працаю ў галінах тэхнічных навук, асаблівай да іх увагаю. Да таго-ж прыкладныя навукі цясьней зьвяжуць Акадэмію з фабрычным варштатам, з зямлёй—карміцелькай і зробяць працу і дасягненьні Акадэміі асабліва зразумелымі і блізкімі кожнаму рабочаму і селяніну.

Шырокія пэрспэктывы, якія адкрываюцца з утварэньнем Акадэміі перад усёй беларускай культурай на ўсходзе і захадзе Беларусі, павінны ўвесь час стаяць перад вачамі будаўнікоў Беларускае Акадэміі. Яны памогуць узяць верны кірунак у працы і абмінуць саўсім магчымыя і зразумелыя ўхілы, як, напрыклад, ухіл у бок г. зв. акадэмічных традыцый, у бок пэўнага правінцыялізму. Неабходнасьць выкарыстаць арганізацыйны вопыт буржуазных акадэмій не павінна ні ў якой меры адхіліць Акадэмію ад тых важных і высокіх мэт, якія ставіць ёй урад і савецкая грамадзкасьць, і калі наша Акадэмія будзе нават не саўсім падобна да сваіх папярэдніх, у гэтым ня будзе нічога ані дзіўнага, ані шкоднага. З другога боку, зусім зразумелыя прынцыпы эканоміі і ўмеркаваньні могуць стварыць пэўны правінцыяльны падыход да гэтае важнейшае справы агульнасаюзнага (а значыць і сусьветнага) значэньня. Беларуская Акадэмія павінна быць і будзе арганічнай часткай сацыялістычнага будаўніцтва, прадстаўніком тае ўмовы, без якое гэтае будаўніцтва наогул немагчыма, прадстаўніком навукі. Затым-жа ў будаўніцтве і арганізацыі Акадэміі павінна быць ужыта самая высокая тэхніка, усе апошнія дасягненьні навукі, да працы ў ёй неабходна прыцягнуць найбольш кваліфікаваныя, здольныя і творчыя сілы, якімі толькі можа распалагаць БССР.

Сваім характарам і зьместам працы, сваімі дасягненьнямі Беларуская Акадэмія павінна выпярэдзіць акадэміі буржуазнага сьвету, бо яна ёсьць часткай таго сацыяльнага парадку, які прыходзіць на зьмену старому сьвету, выклікаючы да жыцьця вышэйшыя формы тэхнікі, гаспадаркі і культуры.

А. СМОЛІЧ.

Электрыфікацыя швэйнай фабрыкі.

ГОМЕЛЬ, 4-Х. На швэйнай фабрыцы закончана электрыфікацыя аддзяленьня па выпрацоўцы жаночае вопраткі. Гэтымі днямі будзе закончана электрыфікацыя аддзяленьня па выпрацоўцы мужчынскае вопраткі. Потым будзе праведзена электрыфікацыя рэшты аддзяленьняў фабрыкі.

Урачыстае адчыненьне фабрыкі адбудзецца ў дні сьвяткаваньня Кастрычнікавай гадавіны.

Дырэктывы ўраду павінны быць выкананы.

ПАСТУПІЛА С.-ГАСП. ПАДАТКУ 3304160 РУБ.—АДСТАЮЦЬ ВІЦЕБШЧЫНА І ГОМЕЛЬШЧЫНА.—ФАРМАЛІЗМ І МАРУДНАСЬЦЬ ПРЫ РАЗГЛЯДЗЕ СКАРГ.

Воўдуг апошніх вестак Наркамфіну БССР, сельска-гаспадарчага падатку ўжо паступіла 3.304.160 руб., што складае 23,6 проц. агульнай сумы налічанага падатку, за выключэньнем з яе дадзеных скідак і ільгот. Такім чынам, першая рата, тэрмін якой скончыўся 10 кастрычніка, можна лічыць выкананай больш як на 100 проц.

Першае месца па выкананьню сельска-гаспадарчага падатку займаюць: Мазырышчына, якая сабрала 27,2 проц. гадавой сумы; Бабруйшчына—26,4 проц. і Магілёўшчына—24,3 проц. На апошнім месцы станць Віцебшчына—21,3 проц. і Гомельшчына—19,3 проц. Апошняя нават не сабрала поўнасьцю таго, што павінна было паступіць у першую рату.

Побач з агульным посьпехам у галіне збору сельска-гаспадарчага падатку назіраецца значная колькасьць нядоімшчыкаў. Па асобных раёнах колькасьць нядоімшчыкаў дасягае нават 50 проц. агульнага ліку плацельшчыкаў падатку. Добрыя вынікі паступленьня с.-г. падатку можна тлумачыць толькі тым, што частка сялянства заплаціла свой падатак адразу за ўсе тэрміны. Вось чаму нельга пераацэньваць вынікі выкананьня першай раты.

Акруговыя выканаўчыя камітэты павінны загадзя прыняць усе меры да ліквідацыі нядоімак. Гэта неабходна, тым больш, што ў 2-ю рату павінна будзе паступіць ужо 60 проц. агульнай сумы падатку. Між тым, вопыт мінулых гадоў паказвае, што выкананьне гэтай раты праходзіць з больш значнымі перашкодамі, чым першай.

Посьпех выкананьня 2-й раты залежыць ад своечасовага скančэньня працы па рэгульваньню сельска-гаспадарчага падатку і выпраўленьня дапушчаных памылак. **Але тут трэба сказаць, што на мясцох прыкмячаецца марудна́сьць у выкананьні пастаўленых задач. Ёсьць раёны, якія толькі ў першай палове кастрычніка пачалі выконваць пастанову Савнаркому ад 13 верасьня.** Акрыканкомы павінны прыняць меры, каб на мясцох пасьпяшылі з скančэньнем працы па рэгуляваньню сельска-гаспадарчага падатку.

На месцы выяжджаў шэраг працаўнікоў Наркамфіну для абсьледваньня працы па рэгуляваньню падатку і выпраўленьню дапушчаных памылак.

Абсьледваньне гэта выявіла шмат недахопаў. Папершае, **далёка ня ўсюды працуюць райённыя падатковыя камісіі.** Падругое, не забясьпечана выкананьне дырэктывы аб гранічна-дапушчальных разьмерах падатку супроць леташняга. **У працэсе разгляду сялянскіх скарг назіраюцца выпадкі фармальнага падыходу і марудна́сьці. Заўважаны выпадкі, калі чырвонаармейская гаспадарка цэлых 2 месяцы дабівалася атрыманьня законных ільгот.** Пры разьмерах скідак гаспадаркам, якія атрымалі значнае падвышэньне супроць леташняга сельска-гаспадарчага падатку, не заўсёды глядзяць на прычыны гэтага павялічэньня і на агульную плацежаздольнасьць гаспадаркі. **Пасьля перагляду індывідуальнага абкладаньня засталося яшчэ шмат выпадкаў няправільнага ўжываньня законаў.**

Наркамфін запрапанаваў акруговым фінаддзелам узмацніць нагляд і інструктаваньне райвыканкомаў і рашуча выправіць усе дапушчаныя памылкі ў сельска-гаспадарчым падатку.

Бліжэйшай задачай райвыканкомаў зьяўляецца выпраўленьне памылак у падатку і ўзмацніць падатковую дысцыпліну, каб забясьпечыць поўнае і своечасовае выкананьне 2-й раты.

У Савеце Народных Камісараў БССР.

Чарговае пасяджэньне СНК адбылося 24 кастрычніка г.г. пад старшынствам тав. Галадзеда, М .М. На гэтым пасяджэньні разам з іншымі былі разгледжаны паступныя пытаньні.

Дзейнасьць Глускага местачковага савету.

СНК заслухаў даклад старшыні Глускага мястачковага савету, Бабруйскае акругі т. Расоўскага аб дзейнасьці местачковага савету.

Мястэчка Глуск зьяўляецца адным з тых 9-ці местэчак БССР, якія вызначаны Саветам Народных Камісараў для гаспадарчага іх упарадкаваньня. Гэтае мястэчка знаходзіцца на адлегласьці 50 клм. ад горада Бабруйску і 25 клм. ад чыгуначнай станцыі Ратміравічы. У мястэчку налічваецца 4.661 чал, насельніцтва, з іх—2.954 яўрэі (63,6 проц.) і 1.697 беларусаў (36,4 проц.) усяго двароў—870. Бальшасьць насельніцтва займаецца саматужнымі промысламі і толькі 186 гаспадарак займаюцца земляробствам, але і гэтыя гаспадаркі часткова займаюцца набочнымі заработкамі, бо зямлі ў іх налічваецца мала. Саматужнікаў налічваецца ў мястэчку каля 600 чалавек, пры гэтым большая частка іх працуе у адзіночным парадку з прычыны адсутнасьці належных памяшканьняў для аб'яднаньня іх у арцелі. Галоўную масу саматужнікаў складаюць шаўцы, краўцы, кавалі, стружачнікі і інш.

Галоўным у рабоце местачковага савету зьяўляецца ўпарадкаваньне мястэчка. У зьвязку з правядзеньнем гаспадарчага ўпараўкаваньня мястэчка значна ўзмацнілася і работа местачковага савету. Насельніцтва мястэчка вельмі спрыяча і ўважліва адносіцца да гэтага мерапрыёмства. Усе пытаньні зьвязаныя з гаспадарчым упарадкаваньнем папярэдне абмяркоўваліся на пасяджэньнях камісіі местачковага савету, на сходах беднаты і г. д.

Дзякуючы правядзеньню ўпарадкаваньня мястэчка частка саматужнікаў ужо аб'яднана ў арцелі. Арцель стружачнікаў налічвае і лік членаў у ёй дасягае 90 чал., арганізавана арцель шаўцоў з 15 членаў арцель краўцоў з 10 членаў арцель смалакураў, малочная арцель, арцель па вырабу цэглы. Усяго ўпарадкавана каля 200сямей.

Пэрспэктывы для разьвіцьця арцеляў ёсьць але адсутнасьць сродкаў і адсаведных памяшканьняў значна перашкаджае пашырэньню дзейнасьці. Арцелі не забясьпечваюцца таксама сырыом у плянавым парадку, адсутнічае арганізаваная рэалізацыя іх вірабаў, на што павінна быць зьвернута ўвага з боку належных органаў.

У мястэчку таксама праводзіцца і зямляўпарадкаваньне, але недахоп зямлі не дае магчымасьці палкам задаволіць тую частку насельніцтва, якая займаецца земляробствам. Па пастанове Бабруйскага АВК мястэчку перадаецца 314 гкт. зямельнага фонду з Лучкаўскай дачы з лясного фонду. Бярэцца ўстаноўка на тое, каб разьвіваць і пашыраць у мястэчку гароднину і птушніцтва ў тых гаспадарках, якія займаюцца земляробствам, бо выстарчальная колькасьці зямлі для іх не хапае.

Калі раней у мястэчку налічвалася шмат гандляроў, то цяпер іх зусім мала. Усяго налічваецца каля 35 гандляроў, але і гэтыя займаюцца выключна дробным гандлем. Насельніцтва мястэчка абслугоўваецца каапэрацыяй. У мястэчку ёсьць 3 каапэратывы, пры гэтым спажывецкая каапэрацыя ахапляе 635 членаў. Прамысловая каапэрацыя абслугоўвае саматужнікаў і працуе з 1925 г. Сельска-гаспадарчая каапэрацыя яшчэ не змагла шырока разгарнуць свае працы.

Местачковы савет зьвяртаў увагу і на правядзеньне такіх мерапрыёмстваў, як самаабкладаньне, рэалізацыя сялянскай пазыкі і 2-й пазыкі індустрыялізацыі і інш. Па самаабкладаньні сабрана 6000 руб., на якія пабудавана яўрэйская сямёгходка. Сялянская пазыка рэалізавана сярод насельніцтва мястэчка на 125 проц. заданьня, рэалізацыя 2-й пазыкі індустрыялізацыі да гэтага часу ўжо дасягае 100 процантаў.

У мястэчку ёсьць 2 сямёгходкі—беларуская і яўрэйская. Ёсьць таксама вячэрняя школа рабочай моладзі. З культурна-асьветных устаноў у мястэчку ёсьць—рабочы сялянскі клюб і народны дом, але масавая праца ў іх правядзіцца слаба. Насельніцтва мястэчка абслугоўваецца местачковым саветам як на беларускай, так і на яўрэйскай мовах.

Справаводзтва ў савеце праводзіцца на беларускай мове. У мястэчку ёсьць больніца, вячэрняя рабочая амбуляторыя і дзіцячая кансультацыя, але ў лекавай справе ёсьць недахопы, якія тлумачацца невыстарчальнай колькасьцю медыкамэнтаў і прылад. У мястэчку ёсьць местачковы камітэт узаемадапамогі, у якім налічваецца 642 члены. Адсутнасьць сродкаў у камітэце не дае магчымасьці даваць дапамогу той беднаце, якая налічваецца ў мястэчку. За сродкі камітэту каапэравана толькі 26 асоб. У часе правядзеньня пасеўных кампаній камітэт даваў магчымую дапамогу земляробаму насельніцтву мястэчка.

У далейшай рабоце местачковага савету стаіць яшчэ шмат задач, асабліва па лініі гаспадарчага ўпарадкаваньня мястэчка, па лініі разьвіцьця саматужна - прамысловай каапэрацыі, па лініі разьвіцьця інтэнсыўных культур (бульбы, гароднины), птушніцтва, вышуканьня новых відаў промыслаў—аб чым зазначалі выступаўшыя ў спрэчках на дакладу.

Для апрацоўкі рэзалюцыі па дакладу местачковага савету ўтворана камісія.

КАМАНДЫРАВАНЬНЕ Т. Т. КАРПА І МІКУЛІЧА Ў МАСКВУ.

СНК пастанавіў камандыраваць т. т. Карпа і Мікуліча ў Маскву ў зьвязку з разглядам у камісіі СНК СССР дзяржаўнага бюджэту БССР на 1928-29 год.

БЕЛАРУСІЗАЦЫЯ У ВІЦЕБШЧЫНЕ ПРАХОДЗІЦЬ СЛАБА.

Гэтымі днямі Нацкамісія ЦВК БССР заслухала даклад старшыні віцебскага АВК т. Валодзькі аб мерапрыёмствах па ажыцьцяўленьню нацпалітыкі ў Віцебскай акрузе.

З дакладу выявілася, што поўнасьцю не ўдалося выканаць усе мерапрыёмствы, якія былі намечаны ў пастанове прэзыдыуму ЦВК БССР ад 16-га лютага 1928 г. па дакладу віцебскага АВК. Слаба працавала і акруговая нацыянальная камісія, якая за ўвесь гэты час зьбіралася ўсяго тры разы.

Праверка стану беларусізацыі ў большай частцы ўстаноў выявіла нядбайныя адносіны да гэтае справы. Беларусізацыя носіць толькі надворны выгляд. Напрыклад, чыгуначнікі на сходах і пасяджэньнях ужываюць беларускую мову пры адчыненьні і зачыненьні сходаў, а ўсе дзелавыя даклады і інш. праца праводзіцца на расейскай мове. Такое правядзеньне «беларусізацыі» можна ваўважыць у судовых установах, на пошце, транспарце і інш.

Ёсьць выпадкі, якія сьведчаць аб поўным няведаньні асноў нацпалітыкі савецкай улады. Быў выпадак, калі пры атрыманьні грошай на далі расьпісацца па-яўрэйску (Віцебская акруговая нацкамісія нават ня ўжыла захадаў па гэтаму пытаньню). У Беларускім Вэтэрынарным Інстытуце, апрача выкладаньня беларускай мовы, як прадмету, яе зусім ня чуваць.

Пераходзячы да дзейнасьці нацсавету, дакладчык адзначае, што ў працы нацсаветаў ёсьць слабыя бакі, якія, як агульнае зьявішча, назіраюцца і ў працы саветаў.

У спрэчках па дакладу т. Валодзькі выступіў цэлы шэраг таварышоў.

Тав. Хацкевіч адзначыў, што ў Віцебскай акрузе ня досыць цьвёрда праводзіцца беларусізацыя. Ёсьць многа пастаноў як па лініі партыйнай, так і па лініі савецкай аб правядзеньні нацпалітыкі ў акрузе. У далейшым гэтыя пастановы трэба толькі выконваць. Задачай віцебскай акруговай нацкамісіі зьяўляецца праверка выкананьня гэтых пастаноў, што да гэтага часу не рабілася. Аб гэтым сьведчыць тое, што нацкамісія вельмі рэдка зьбіраецца. Правядзеньне нацпалітыкі трэба навіраваць па лініі грамадзкасьці, па лініі прафсаюзных арганізацый. У гэту справу трэба ўцягнуць шырокія працоўныя масы.

Тав. Бейлін спыніўся на тым, што ў Віцебску не разумеюць сутнасьці нацпалітыкі. Калі на фабрыцы «Дзьвіна» адзін рабочы хацеў выступіць на сходзе па-беларуску, яго затукалі і ён мусіў перайсьці на расейскую мову. На сходах савецкіх партыйных ячэек ніхто ня выступаў па-беларуску.

— Я лічу,—кажа т. Дудзін,—што трэба больш рашучасьці і цьвёрдасьці ў правядзеньні нацпалітыкі ў Віцебскай акрузе.

ПРАЕЗДАМ ПРАЗ УКРАІНУ.*)

Украінізацыя.

Але, калі для украінцаў Кіеў, як для нас Віцебск, ці Гомель, то гэта толькі з боку адміністрацыйна-гаспадарчага. У справе разьвіцьця культуры, або ў скутках ажыцьцяўленьня нацыянальнае палітыкі партыі і ўлады—Кіеў зусім іншая справа, ніж наш Віцебск ці Гомель. Мы ніяк і нікому ня можам пахваліцца рэальнымі дасягненьнямі адпечанага характару—ні ў Віцебску, ні тым болей, у Гомелі. Нацыянальная палітыка, асабліва ў галіне беларусізацыі, у гэтых нашых гарадох кульгае на абедзьве нагі, яна яшчэ ходзіць там украдкаю, тулячыся. Іншае ў Кіеве: тут ужо Харкаў астаўся далёка ззаду. Толькі ўступаеш на кіеўскі брук, як цябе абдае атмасфэра сапраўднае Украіны. Цягнік, што вязе вас з Харкаву ў Кіеў, са ўсімі надпісамі паўкраінску; на ўсіх станцыях—падвойныя надпісы—парасейску і паукраінску.

У вагонах—за малым выключэньнем—гутарка украінская. А ўжо на кіеўскім вакзале—дык надпісы—украінскія. Кандуктар вагону, вакзальны вартаўнік, трамвайны важаты—ніхто іначай з вамі ня гутарыць, апроч як паукраінску. І нават, калі ты кажаш парасейску—табе адказваюць паукраінску. Пра шыльды не даводзіцца і казаць, апроч украінскіх—іншых надпісаў з цяжкасьцю знойдзеш. Тое самае і з надпісамі ў кіно—кіёўляне ўжо шэраг гадоў чытаюць іх паукраінску. Гутарка на вуліцах—пераважна украінская, і толькі рэдкія адзінкі—ці з русіфікаваных чыноўнікаў, ці з рэшткаў гандляроў—тужацца ісьці супроціў агульнага настрою, гэтак натуральнага і бадзёрага ў кіеўскіх умовах.

Якраз у мой прыезд у Кіеў ішла канчатковая праверка украінізацыі ў савецкіх установах. Чатыры тысячы служачых, падзеленыя на катэгорыі, адпаведна ступені іх ведаў, мусілі вытрымаць экзамен па украінізацыі. Камісія рашуча і настойна падыходзіла да кожнага, не даючы жаднае палёгкі. Мне давялося пачуць скаргу аднаго прафэсара, якога, у ліку іншых, выключылі з палітэхнічнага інстытуту за нівытрымку экзаменаў па украінізацыі. Ён з мінаю жалю абярнуўся да мяне з гэткімі словамі:

— Я, хіба, паеду да вас, у Беларусь; там, я чуў, ня вельмі востра стаіць пытаньне з вывучэньнем беларускае мовы. Кажуць, што ў вашых вышэйшых навучальных установах большасьць прафэсуры і кіраўнічага пэрсаналу гавораць парасейску—і нічога. Вунь наш кіеўскі прафэсар Цітоў, паехаўшы ад нас, спакойна сябе адчувае наконт беларусізацыі... Я прафэсара скаржніка балюча разуверыў, сказаўшы яму, што беларусізацыя абавязкова і што ўсе Цітовы і ім падобныя мусяць вывучаць беларускую мову.

— Ну,—разьвёў рукамі прафэсар:—тады я паеду ў Маскву.

Я знашоў гэты выбар правільным для прафэсара, які за дзесяць гадоў савецкае ўлады ня мог згадзіцца з яе нацыянальнаю палітыкаю.

Але гэткіх прафэсароў у Кіеве мала—гэта белыя вароны. Там з украінізацыяй не жартуюць.

— Наша арганізацыя, лікам у сямнаццаць тысяч сяброў—украінізавана амаль не на ўсе сто процантаў,—хваліўся мне мой сябар;—вось паглядзеце—наш арсэнал: васьмісотны калектыў УКП, і кожны яго член выпісвае газэту акругкому на украінскай мове.

На канфэрэнцыях вы зрэдка пачуеце іншую, апроч украінскай, мову.

Ды гэта вядома—Кіеў не Адэса.

У гэтых адносінах, як я ўжо сказаў, Кіеў далёка апярэдзіў Харкаў. Ды гэта зразумела:—будучы дзесяцігодзьдзямі апорным пунктам шульгоўшчыны, цэнтрам самадзяржаўна-чорнасоценнае русіфікацыі, Кіеў зараз стаў адным з асяродзьдзя Чырвонае Украіны. Ён умацоўваецца, як фартэцыя рабоча-сялянскае краіны. Разам з залатымі галовамі лаўраўскіх цэркваў, аблезлы надзеі замежнай і ўнутранай гэтманшчыны. Здаецца, на многа нізэй апусьціў сваю булаву занядбаны Хмяльніцкі, і зьніклі ў небыце многаслоўныя гутаркі радных у будынку, які цяпер пад музэем рэвалюцыі. Насупроціў яго, на вуліцы Караленкі, выдзяляецца трохпавярховы будынак Украінскае Акадэміі, дзе былы старшыня Рады сумленна, старанна працуе над фаліянтамі гісторыі.

Затое наўскасяк, у вагромністым тэатры, памятным па забойству ў ім Сталыпіна ў 1911 г. зараз адбываюцца шыкозныя выставы аднае з украінскіх опэр. Маладыя сілы маладое Украіны зацягла і спора будуюць магутную украінскую савецкую культуру. Трэба дзівіцца посьпеху іх працы, гэтак рэльефна і гэтак багата афармленай у гэтым выглядзе мастацтва. За лічаныя гады спакойнага будаўніцтва вы спатыкаеце шэраг дасканалых вагромністых вынікаў у галіне украінскае культуры. Вось і тут перад вамі стройны, манаўлітны калектыў працаўнікоў з таленавітымі рэжысэрамі, мастакамі, артыстамі. Перад вамі мастацкія вобразы закончаных пастановак і дасьціпнай захапляючай ігры...

Тое самае і у дзяржаўным драматычным тэатры Ігната Юры, якога так любяць і так шануюць кіеўскія рабочыя.

На ўвесь сэзон драматычны тэатр пад кіраўніцтвам Юры запоўнены гледачамі...

Не пакідае Кіеву і вэтэран украінскае сцэны—Саксаганскі. Час ад часу ён вяртае з свае падарожы па вёсках і паказвае кіяўлянам рэчы з блясьчнага украінскага рэпэртуару.

Не адстае ад тэатральнага украінскага жыцьця ў Кіеве і жыцьцё музычнае, літаратурнае, навуковае і кінатэатральнае. Кіеў упарта куе украінскую савецкую культуру, упарта працуе над яе разьвіцьцём і поступам.

Гэтага нельга не заўважыць, пералічваючы дзесяткі культурных устаноў, раскіданых па ўсяму Кіеву. Тэатры, музэі, акадэмічныя установы, рэдакцыі часопісаў, газэт, вышэйшых і сярэдніх навучальных устаноў і управа вялікага і значнага ў наш час культурнага прадпрыёмства, як Вуфку—усеукраінскага дзяржаўнага кіноуправленьня.

Вось гэта апошняя ня можа не зьвярнуць на сябе ўвагі кожнага, хто наведвае Кіеў у справе культурнай. Каб азнаёміцца з кіраўнікамі Вуфку, з яго працаю і з плянамі гэтае працы—я і зайшоў да т. З. Сідэрскага, які да гэтага часу быў у ліку кіраўнікоў гэтае ўстановы.

Кіно-справа на Украіне.

Як і другія галіны культурнага і гаспадарчага будаўніцтва, шпаркім крокам ідзе на Украіне разьвіцьцё кіносправы. Вытворчасьць украінскага дзяржкіно займае звыш дваццаці процантаў агульна-саюзнай кіновытворчасьці. Гэта тым болей высокая лічба, калі параўн

ПРАВЕРКА—САМАКРЫТЫКА—КАНТРОЛЬ МАС.

Шкоднікаў нашага сацыялістычнага будаўніцтва

П'ЯНІЦ—РАСТРАТЧЫКАЎ

Ну, і кіраўнікі!

(Полацак).

У п'яным угары забылі валынецкія «начальнікі» свае абавязкі. П'янствамі ў адзіночку і кампаніяй—старш. РВК Палуяў, старш. РЗК—Дземчонак, старшыня крэдытнага т-ва—Эрдман. Многія сельсаветы, карыстаючыся прыкладам райённага «начальства», усю сваю працу таксама зьвялі да чаркі. Па шэрагу сельсаветаў рабіліся злачынствы, растраты, падлогі, хабары. РВК рэвізій не рабіў, а дзе яны былі, дык толькі для адводу вачэй.

Крэдытнае т-ва, у складзе ўпаўнаважаных якога было 65 проц. заможных сераднякоў, на чале з Эрдманам, 6 проц. кулакоў і толькі 18 проц беднякоў, выдавала ссуды сераднякам і кулакам, а беднота часта атрымлівала «хвігу».

Працаўнікі спажывецкае кааперацыі часта паладжвалі папойкі. Райзямкамісія зямлю аддавала кулакам і нават былым папам, а беднота заставалася так сабе. Скаргі сялян на злачынствы РЗК і яе асобных працаўнікоў бяз усякіх вынікаў падпываліся ў справы. У самым райённым цэнтры—Валынцах сярод іншых партыйцаў таксама было п'янства. РК КП(б)Б кіраваў слаба; замест кіраўніцтва фракцыяй РВК ужывалася дробязная апека. У ячэйках адчуваўся зажым. Самакрытыка была ў загоне, аб злачынствах гаварылі шэптам па закутках, адкрыта гутарыць баяліся. Баючыся грозпага «начальства», Валынецкая ячэйка пры перавыбарах рабіла тайнае... галасаваньне.

Палуёў жыў на кватэры ў былога гандляра, і калі гэтага гандляра сельканісія абклала падаткам, дык Палуёў гэтую пастанову зьмяніў. Але «колькі вяровачка ни вейся, павінен быць канец»,—кажа пагаворка. Гэтакі канец прышоў і п'янаму кіраўніцтву. Аб усіх злачынствах даведаліся АК і АКК РСІ і зрабілі абгляд райёну, у выніку чаго сакратар райкому Кучынскі, старшыня РВК—Палуеў, старшыня РЗК—Дземчонак і старш. крэд. т-ва Эрдман зьняты з працы, а справа аб валынецкіх „працаўніках" перададзена пракурору.

Мік. С.

НЕ ЛЯСЬНІЦТВА, А КАРЧМА.

Іванаўскае лясьніцтва зьяўляецца адным з першых у Менскай акрузе па прыбытковасьці і вацтоўнасьці лесанасаджэньняў. Але справа ў лясьніцтве пастаўлена да ўзкаду дрэнна. Лясьнічых і памощнікі лясьнічых мяняюцца амаль кожныя тры месяцы (у працягу 1926-27 г. перамяніліся 4 лясьнічыя і 2 памощнікі).

Апошнія абставіны—адсутнасьць ньеўрдай гаспадарчай рукі—адбіваецца на якасьці працы лясьніцтва па эксплёатацыі, лесу, ніс вертаньні і лесакультурных мерапрыемствах.

Рабочым у лясьніцтве ўпісваецца не ў свае справы і ўзяў у свае рукі кіраваньне лясьніцтвам, прычым, вельмі часта на карысьць асабістых інтарэсаў, выпісьвючы тых людзей, якія яму не падабаюцца. Плётні і інтрыгі зьвілі сабе тут трывалае гняздо.

Затое на прафесыянальнай лініі амаль нічога ня робіцца, культ-асьветная работа не вядзецца, бібліятэкі няма.

Ды навошта рабочкому Іванаўскага лясьніцтва займацца культ-асьветнай працай, калі замест чытаньня кніг можна выпіць і закусіць? Ён скажаце—дзе-ж узяць грошы на выпіўку? —Вось гаўства, а лес на што існуе, калі не для гэтага. Хто ў лесе ня злодзей, той дома не гаспадар—так разважаюць абсчыкі і лясьнікі Іванаўскага лясьніцтва, і кожны заніхаўся ажыцьцявіць гэту прынцып, як мог.

Нярэдкім да фактаў. Старшыня рабочкому, аб'езьдчык Чарвінскі, супольна з лясьнікам бралі грошы за падчыстку дзялянак, але работа ня праводзілася, а грошы ішлі ў кішэні. На дзялянцы № 19 урочышча „Вядрэнкае" быў складзены акт аб агляцы, за што лясьніцтва выплаціла 112 руб. гр. Дубоўскаму. На справе лінія падчыстка не праводзілася. Гр. Дубоўскі та іншу 50 руб. сабе за „фатыгу", а рэшту грошай перадаў лясьнічаму Балкоўскаму для далейшай перадачы Чарвінскаму.

Аб'езчык Чалоўскі здаў у ур. «Сянетава» вучастак пахаты, які належыць лясьніцтву, а грошы ўзяў сабе.

Былі і такія выпадкі, калі замест сухастою клаймілі сыраростучыя дрэвы. Аб'езчык Батвінка сам не клаймію лес, а даручыў гэту справу лясьніку. Апроч гэтага, аб'езчык Батвінка пратаколы аб пасечках часта ня перадаваў у канцылярыю лясьніцтва, лясьнічы рабілі ў яго што хацелі, а сам ён піў і гуляў.

У лесе вельмі трудна спаткаць лясьнічого, за тое штодня можна спаткаць каля Каванікай крамы ганаровую варту з п'яных лясьнікоў, якія з ўсёй пачырасьцю лясных людзей уступаюць у бойку з казнаратарамі і напрапалую б'юць шыбы ў вокнах сяляк.

Актыўным памощнікам гэтай хоўры зьяўляецца рахункавод Біруля, які дапамагае гэтай распусьце. Калі аб'езчык Сушкевіч напісаў скаргу на направільныя пастукі памощніка лясьнічага Панкаўца, то Біруля, як вельмі паслухмяны рабочкому працаўнік, зьнічыў гэту заяву.

Калі адміністрацыя звальняла працаўнікоў за п'янства, за хабар, то рабочком дакагаўся прыёму іх ізноў на службу. У выніку гэткай «пратэкцыі» з боку рабочкому прышлося выплаціць звольненым больш 1000 руб..

Райком саюзу, да стыду, ня толькі не дапамагаў зьліквідаваньню гэтае брудзкае справы, але, наадварот, падтрымоўваў увесь час рабочком. Тым часам, гэта балота разраслося да ненамерпай велічы, дасягнуўшы разлажэньня апарату лясьніцтва.

Трэба неадкладна правесьці чыстку ў лясьніцтве, трэба з храсткамі выкараніць хабарніцтва, п'янства і лядайнасьць, што ператварыло сабе моднае гняздо ў Іванаўскім лясьніцтве.

Крупень.

ХУЛІГАНАЎ—АНТЫСЭМІТАЎ

„ХУДОЖ'НІК" ПУШКІН ЗА „ПРАЦАЙ",

Некалькі месяцаў таму назад мае давалося быць сьведкам аднаго „культурнага" начынаньня—наглядаць, як багачык Клімавіцкага нардому «художнік» Пушкін, успомніў «добры стары час», забыў пад хмелем, што час гэты даўно адышоў, і што «жыдоўскія морды» ў СССР ня служаць палатном для творчасьці гэткіх «художнікаў», як Пушкін.

Хістаючыся, як кажуць, налева і направа, увайшоў Пушкін у буфэт пардому, як'м ён кіруе.

Адбывалася вечарына, грала музыка, адны скакалі, другія сядзелі ў буфэце.

Пушкін увайшоў і, цяжка апусьціўшыся ў крэсла, запатрабаваў пару піва.

Калі-ж буфэтчык адмовіўся выдаць яму піва раней таго, як ён заплаціць яму доўг за папярэдні набор, то з вуснаў «культуртрэгера» пасыпалася грубая лаянка і выразы, якім пазайздросьціў-бы кожны член «союза русского народа».

І ў «жыдоўскую морду» (буфэтчыкаўрэй) палятцелі пустыя бутэлькі, шклянкі і г. д.

Спыніліся танцы. Публіка пачала ўцякаць з буфэту. Са звонам палятцела на падлогу лямпа, пачуўся звонкі гук аплявухі. У паветры вісела ўвесь час: „жыдоўская морда", «іду біць жыда» і г. д. Здавалася, што ўсё гэта здыбалася не ў пардоме і не пры савецкай уладзе, а ў мінулыя чорныя часы.

Склалі пратакол. Справу перадалі ў суд.

І думаў я...

Думаў, што можа думаць усякі, прачытаўшы гэтыя радкі...

Быў суд.

І што-ж?

— Вядома, скажаце—адправілі яго...

Не—апраўдалі...

Так, апраўдалі...

Крыўдна стала для «художника». За ўсякія глупствы цягаюць па судох...

І, лічачы для сябе непрыстойным далей працаваць сярод «серой массы», якая ня можа зразумець яго высокай паэтычнай душы, атрымаў ён з адведных устаноў належныя пасьведчаньні і пайшоў шукаць па сьвету, «где оскорбленному есть чувству уголок...»

І знайшоў... У горацкай С.-Г. Акадэміі. Там ён цяпер „сеет разумное, доброе, вечное..."

— Талент, скажаце вы—трэба сьцерагчы.

Так, талент... І не талент, а талеціна!

Лічу, што гэтай справай зацікавіцца пракуратура.

А. П—ў.

Узмацьніць барацьбу з хуліганамі.

Ёсьць у в. Смалявічах вядомы хуліган Кірыльчык Мікола, які не адзін раз ужо прыцягваўся да адказнасьці.

10-га жніўня 1928 году гэты хуліган—Кірыльчык—прышоў у пардом, у адным з пакояў якога адбывалася пасяджэньне бюро яч. ЛКСМБ. Кірыльчык зайшоў туды і давай усіх крыць матам...

Яго папрасілі супакоіцца... але ён ня ўвімаўся... маць вашу... так!.. разгэтак я сам начальства, што хачу то і раблю.

Адзін хлопец паспрабаваў падыйсьці да яго, каб угаварыць, але Кірыльчык яго так кінуў, што той ледзь падняўся.

Так і не даў ён праводзіць пасяджэньне бюро.

Б. Дзяруга.

ХЛУСЬЛІВЫХ АБВЯРГАЦЕЛЯЎ

Трэба скончыць з хлусьлівымі „абвяржэньнямі".

Як было ўжо адзначана апошнім пленумам ЦКК УсеКП(б), справа разгортваньня самакрытыкі сустракае цэлы шэраг перашкод і супраціўленьня з боку ўсялякіх «глушыцеляў» самакрытыкі, «лякіраваных» бюракратаў і вельмі часта і з боку наогул нясумленных людзей.

Мы таксама ведаем, што найбольш рашучыя посьпехі ў справе самакрытыкі мы маем у друку, які заваёўвае першае месца ў разгортваньні самакрытыкі. Зараз навялічылася ўвага да друку, і апошні зараз стаў сапраўды моцнадзейнічаючым сродкам самакрытыкі. Але гэтыя посьпехі ня могуць нас зусім здаволіць. Ёсьць яшчэ выпадкі, калі да крытыкі ў друку адносяцца нячула, бюракратычна. І ў першым радзе гэтых выпадкаў трэба паказаць на так званыя „абвяржэньні". Не абвяржэньні, якія выпраўляюць асобныя памылкі крытыкі, а «абвяржэньні» хлусьлівыя, якімі вялікія і дробныя бюракраты пытаюцца замест выпраўленьня сваіх памылак агульнымі размаўленьнямі пусьціць туман у вочы грамадзкасьці.

Супроць такіх «абвяржэньняў» мы павінны накіраваць увесь агонь крытыкі і рашучага ўзьдзейнічаньня. ЦКК-РСІ зьвярнула сваю ўвагу на адзін такі прыклад, аб якім пісалася ў «Савецкай Беларусі». У кароткіх рысах мы яго напомнім (гл. «Сав. Бел.» № 223 і «Працаўнік Асьветы» № 11). На падставе дакумантаў было ўстаноўлена, што Ветрынскі РВК некалькі зноўжывае перавідкамі настаўнікаў.

А што направільнасьці ў гэтым вельмі дрэнна адбіваюцца на працы, мы гэта добра ведаем. І што тут бываюць сапраўды «фантастычныя» прыклады, як у 26-27 г. у Буда-Кашалёўскім райёне звольнілі настаўнікаў на падставе таго, што „настаўніца бросіла свайго мужа—сакратара РВК і зышлася з настаўнікам"—аб гэтым мы таксама добра ведаем з матар'ялаў ЦКК-РСІ, якой даводзілася займацца і такімі «цудоўнымі» справамі.

І вось, зьвяртаючыся да ветрынскага прыкладу, дзе, мабыць, цудаў і ня было, а было толькі захапленьне перакідкамі, мы павінны адзначыць, што ветрынцы, ня гледзячы на дакументы, якія маюцца ў рэдакцыі і якія ім таксама вядомы, накіравалі ў «Сав. Беларусь» такое гэройскае «абвяржэньне», міма якога ніяк ня можна прайсьці. Абвяржэньне яны напісалі ў такіх выразах, вельмі «скромных» і вежлівых:

—„Заметка ніводным словам не адпавядае сапраўднасьці".

— „Аўтар жадае хлусьнёй зрабіць сабе аўтарытэт".

— «Аўтар ёсьць самы цьвёрдалобы шкоднік».



А ЁН, АБВЯРГАЦЕЛЬ, ПІША І ПІША...

Абвяргацель так разышоўся, што забыў аб фактах, аб справе. Ён упаў у бюракратычную істэрыку і амаль што не патрабуе віселіцы для селькора, які пасьмеў...

Ён, абвяргацель, амаль што ведае, хто пісаў аб гэтым, таму ён «пужае» селькора. Але...ён памыліўся. У наш час самакрытыкі нічога вось і брэхам ня зробіш. А толькі, мабыць, дасі добры матар'ял для фэльтону ў «Савецкай Беларусі». І для таго, каб і ЦКК-РСІ тут казала сваё наступнае пантэрэдзяньне:—гэты брэх „заслугоўвае", каб налажылі нейкае пакараньне за гэтую бюракратычную лаянку.

І сапраўды, калі-б такая лаянка здарылася ў грамадзкім месцы, такога-б прыцягнулі да адказнасьці за хуліганства. А ЦКК-РСІ лічыць, што лаянка, накіраваная супроць селькора і газэты, зьяўляецца таксама нейкім грамадзкім «хуліганствам», якога пакінуць без пакараньня ніяк ня можна. Вось чаму ЦКК-РСІ даручыла Полацкай КК-РСІ гэтага абвяргацеля «ўзяць за вушко да на сонейка» і навучыць яго так, каб ён у далейшым зразумеў што такое самакрытыка, што вуха нашае пралетарскае самакрытыкі ня можа ніяк цярпець, каб людзі хлусілі ў вочы грамадзкасьці, каб без усякага сораму яны пісалі нікчэмныя і беспадстаўныя «абвяржэньні».

Сваё даручэньне Полацкай КК-РСІ

ТАВ. ЖАЛЕЗНЫ „АБВЯРГАЮЦЬ"...

У нашай газэце за 16 верасьня г.г. (№ 214) селькор скардзіўся грамадзкасьці, што ў Магілеўскім райвыканкоме невядома за вошта зьнялі з працы настаўніц Цыганкову і Пракоф'еву, а замест іх прызначылі знаёмых старшыні РВК.

Прачытаў старшыня райвыканкому т. Жалезны заметку селькора і аж пабялеў ад злосьці...

— Як, мяне?.. Мяне, Жалезнага, чапаюць...

У-у-у... «Щелкоперы проклятые"... Але пачакайце. Я вам...

І роўна праз месяц пасьля надрукаваньня заметкі рэдакцыя газэты атрымала абвяржэньне.

«Цыганкова і Пракоф'ева былі зволены з працы не чамусь-та, а як памеўшыя адпаведнай адукацыі", абвяргае т. Жалезны.

Звольнілі кажаце як непадрыхтаваных, але на справе відаць, што тут ёсьць нешта іншае, аб чым і сьведчаць наступныя радкі, атрыманыя рэдакцыяй.

«... Інспэктура НКА паведамляе, што на допісу ў газэце «Савецкая Беларусь» за 16 верасьня было зроблена дасьледаваньне, пасьля якога настаўніцы Пракоф'ева і Цыганкова адноўлены ў правах настаўніц»...

Дык вось што, т. Жалезны, калі-б яны білі такія непадрыхтаваныя, дык, будзьце супакойны, органы Нарасьветы напэўна не адпавілі-б іх у правах настаўніц...

— „Прызначэньне на працу ў васковыя школы т. т. Замастоцкай і Нікіцінай—піша далей т. Жалезны—была не па знаёмству старшыні Жалезнага, а па падставе пастановы прэзыдыуму Маг. РВК".

Я, кажа, іх зусім ня ведаю і нават у вочы ня бачыў. Праўда, Замастоцкую недаю з 10 чэрвеня, як загадчыку апорнага лікпункту, з якім яна ня справілася».

— Вось табе, бабушка, і юр'еў дзень... З лікпунктам ня справілася, дзеля гэтага і прызначылі яе ў пачатковую школу.

«Пагэтаму асобнай палітыкі Жалезнага не магло быць», заканчывае сваё абвяржэньне т. Жалезны.

Выбачайце т. Жалезны. А хто-ж тут варажыў? Хто на пасьдзяньні райвыканкому падтрымліваў гэту кандыдатуру?

Зьнімалі настаўніцу толькі за тое, што ў яе ня было „ніякіх зьвестак аб адукацыі» і прызначылі на яе месца яўна ня справіўшуюся з лікпунктам Выбачайце, такое «сальто-мартале» можна тлумачыць выключна галавацяпствам, або пратэкцыянізмам, аб якім і пісаў наш селькор.

Сваім абвяржэньнем т. Жалезны зьбіраўся захаваць праўду і, як гаворыцца, «втереть очки" савецкай грамадзкасьці але гэта яму на ўдалося.

Няхай гэта будзе прыкладам усім іншым абвяргацелям, якія хлусьнёй стараюцца зажаць разгортваючуюся самакрытыку мас.

В. Зайцаў.

Вам хто дазволіў пісаць?

Некаторыя працаўнікі Барысаўскага РВК надта ня любяць селькораў, якія выяўляюць усе непахоны ў нашым райёне.

У ліку іх знаходзіцца і загадчык райкамгасу т. Трусаў.

Часта ў адсутнасьць старшыні РВК ён застаецца намесьнікам і у гэты час адчувае сябе вялікім начальнікам.

Ня так даўно ў адной газэце была надрукавана заметка, у якой гаварылася, што КСУ згнаіў сена і бульбу.

Гэта заметка, як відаць, надта абурыла ганаровага «начальніка».

І Вось, аднойчы, калі рабкор С. зьявіўся у РВК, каб пагаварыць па тэлефону, т. Трусаў утаропіўся на яго і адчыбучыў:

— Скажэце, калі ласка, хто гэта дазволіў вам пісаць у газэту бяз ведама РВК?

— Выбачайце, паважаны тав. Трусаў, што не запыталіся ў вас, ці можна нам пісаць у газэту. Мы ведаем, што вам часам цяжка адказваць на заметкі, але вам прыдзецца гэта рабіць. З свайго баку мы напамінаем вам, тав. Трусаў, што вашы адносіны да селькораў і іх заметак павінны быць зьменены.

Жала.

БЕСТАЛКОВЫХ ГАСПАДАРНІКАЎ

Чаму яны не пакараны.

У канцы мінулага году скураны завод працалектыву, за адсутнічаньнем сыравіны, быў пад пагрозай прыйнику. Жадаючы ўзмацніць працу завода, загадчык калектыву скурнікаў ня траціў лішняй гадзіны. Суместна з спецам Левіным ён хутка накіраваўся ў Маскву, каб закупіць сыравіны. Барысаўскія купцы, прыбыўшы ў Маскву, прасядзелі там звыш 15 дзён, але ўсё засталася бяз усякіх вынікаў. Але шчасьце, як гэта гаворыць, падплыло. Спацыруючы па адной з вуліц Масквы, яны ўбачылі надта цікавую вывеску, на якой была надрукована вялікімі літарамі «прыватная камісійная контора» нейкага перса Абдул Карыма Ісакава.

Здаволеныя гэтай цікавай вывескай, працаўнічкі Барысаўскага працалектыву зьвярнуліся да Абдула. Колькі яны там гутарылі, невядома. Але дагавор быў заключан хутка. Закупіўшы 3000 аўчын сыравіны, спецы накіраваліся ў Барысаў, весела раскурываючы папяросы. Ня доўга прышлося чакаць тавару, ён хутка прыбыў на месца. І тады ўбачылі вельмі цікавую карціну. З прыбыўшай сыравіны палова аказалася гнілой. Доўга думалі спецы што рабіць. Накіраваць назад, будзе нядобра, і пераплылі сыравіну ўзяць. Што-ж, апрацуем, павысім цэны і будзе добра. Вышла зусім інакш: тавар страціў сваю якасьць і ход. У выніках прадажы і апрацоўкі, завод панёс 13000 руб. дэфіцыту. Між тым ёсьць прапанова вышэйшых устаноў, што купляць тавар у прыватніка забараняецца. Але для працаўнікоў Барысаўскага працалектыву гэта прапанова зусім не датычыцца. Усё сьціхла, праходзяць дні і м-цы, а гэтай справай ніхто ня цікавіцца. Замест таго, каб пакараць вінаўных за безгаспадарчасьць, упаўнаважаны працалектыву Энцін назначае Лускіна на больш адказную працу, другога пераводзіць на працу ў ЦРК. Цяпер яны, як ні ў чым ня бывала, працуюць на больш адказных пасадах. Усе гэтыя праделкі высьветлены. Толькі цікава ведаць, дзе знаходзіцца гэта справа. Напэўна, дзе небудзь ляжыць бяз усякага руху ў гушчы канцылярскіх папер Менскага працалектыву. Трэба спадзявацца, што належныя ўстановы падрабязна высьвятляць усю справу і вінаўныя будуць пакараны па заслугах.

А. С.

РЫСКАЎСКАЙ ДЗІЦЯЧАЙ КАЛЁНІІ ПАГРАЖАЕ РАЗВАЛ.

(Ліст з Бабруйску.)

Сумна і балюча гаварыць пра тое, што творыцца ў Рыскаўскай дзіцячай калёніі. Становішча калёніі наводзіць жудасьць і само на сабе выклікае пытаньне аб тым, як абслугоўваючы калёнію персанал, разам з загадчыцай дапушчае такія рэчы.

Мы ня маем права гэтую калёнію называць домам для выхаваньня дзяцей. Ні ў якім разе, бо выхаваньне і становішча дзяцей калёніі вядзецца няхайна і злачынна.

Безгаспадарчасьць выглядае на кожным кроку. Наступае зіма, сьвітча халодны сівер, а памяшканьне калёніі ня думала рыхтавацца да зімы; яно і цяпер яшчэ з яе разьбітымі шыбамі, скрозь якія вольна гуляе на пакоям калёніі вецер. І вось на гэтым ветру, у холадзе і прыходзіцца жыць і мерзнуць выхаванцам калёніі.

Поўбяды яшчэ дзём. А настае ноч і адубяеўшыся ад холаду дзеці шукаюць ратунку у іншых месцах: на печы, пад печкаю і г. д.

Але неабгледжанасьць будынку—адна бяда. Усьлед за холадам ідзе другая бяда. Здавальненьне калёніі прадуктамі праводзіцца вельмі ненармальна, абслугоўваючы персанал карыстаецца дзіцячымі прадуктамі за кошт зьмяншэньня порцы харчаваньня дзяцей. Ды што казаць порцы. Тут яны ня існуюць: ніхто за харчаваньнем дзяцей ня сочыць і меншыя дзеці заўсёды зьяўляюцца старэйшымі (Хто сьмела, той два зьеў).

Галодныя дзеці вышукваюць дзесьці на гародзе сырую бульбу і кінуць яе на агні ў бані, у лесе і дзе толькі магчыма. Усё гэта праходзіць у той час, калі калёнія мае пекальні кароў (малаком карыстаецца абслугоўваючы персанал), калі ўраджай бульбы на полі калёніі быў добры. Але бульба, на вялікі жаль, з прычыны поўнай безгаспадарчасьці загадчыцы калёніі гр. Рутштэйн, вось ужо некаторы час на холадзе і марозе ляжыць выкапанаю на полі. Вялікая частка яе ўжо згніла, астатнюю частку чакае такі самы лёс.

Яшчэ болей страшным робіць становішча калёніі тая грязь, няхайнасьць і антысанітарнасьць, якая панує ў калёніі. На працягу некалькіх тыдняў дзеці ня бываюць у лазьні, вопратка і бялізна на іх не мяняецца. У выніку такога становішча значная частка дзяцей зьяўляецца хворай на карасту, у бяліяльне дзяцей кішаць паразыты.

Па начах дзеці аддадзены самім сабе. Абслугоўваючы персанал калёніі не падтрымоўвае дзяжурстваў у калёніі. Дзеці робяць што хочуць.

Да ўсяго гэтага загадчыца калёніі адносіцца зусім спакойна, ня прымаючы ніякіх захадаў да аздараўленьня абставін жыцьця дзяцей. Наадварот, яна ў выпадку чаго зоўка запусьціць лепчака на шчаце якога небудзь 5 гадовага выхаванца, абазве скацінаю, накрычыць, назычыць і на гэтым яе выхаваўчая і кіраўнічая праца канчаецца.

Ёсьць у калёніі і конь, але на ім большай часткай езьдзяць «у госьці» куды хочуць і калі хочуць.

Вось у такім становішчы прыходзіцца выхоўваць будучым савецкім грамадзянам.

А. Д.

ВАЛАКІТЧЫКАЎ І ІНШЫХ

Дакуль так будзе?

(Полацкая акруга).

Заўважваюцца вусім дрэнныя адносіны да распаўсюджаньня сельска-гаспадарчых машын в боку Полацкага цэнтральнага земскладу. Так, яшчэ ў мінулым годзе аграпункт Полацкага райёну заказаў праз земсклад некалькі сельска-гаспадарчых машын, в разьлікам, каб іх атрымаць да вясеньняй пасеўкампаніі 1928 г. Але машыны атрыманы толькі тады, калі скончылася пасеўкампанія (у дадатак ёсьць машыны без некаторых частак).

Такія-ж выпадкі былі і ў асеньнюю пасеўкампанію. Той-жа аграпункт заказаў праз земсклад сеялку, якая павінна была працаваць да часу пасеўкампаніі. Але сеялку атрымалі толькі ў верасьні месяцы, калі ўжо амаль скончылася асеньняя сяўба.

Дакуль-жа так будзе працягвацца.

Т. В.

Нячуваны зьдзек над селянінам.

У селяніна бедняка вёскі Стаі, Круглянскага райёну, здох конь. Сельсавет склаў акт і накіраваў яго ў страхавое агенцтва. Здаецца—усё ўпарадку. прайшоў тыдзень. Галаўкоў (прозьвішча селяніна) пашоў у страхагенцтва. Прыдзі пазьней, адказаў страхагент Чатыркін. Праз тыдзень Галаўкоў ізноў у страхагенцтва. «Прыдзі пасьля», ізноў атрымаў селянін адказ. Мінула яшчэ некалькі часу. Галаўкова ізноў можна было бачыць у страхагенцтве. Прыдзі заўтра, прыдзі пасьля—лаяўся страхагент. Так селянін—бядняк хадзіў чатырнаццаць разоў у страхагенцтва. А вёска ад мястачка—за 20 кілёмэтраў. Селяніну бедняку давялося адмерацьць 560 кілёмэтраў пакуль атрымаў няшчасных 30 рублёў, давялося страціць два рабочых тыдні, стаптаць дзесятак лапцяў. Мы ня дзівімся такімі паводзінамі страхагента, бо ён з «белай косткі», ён былы мікалаеўскі дзяржыморда—«гонар імпэрыі»—афіцэр. Нас ня дзівяць такія паводзіны Чатыркіна. Нам толькі дзіўна, чаму пракуратура ня зьніме яго з працы, бо за ім гэта ня першы раз наглядаецца. Чакаем слова пракурора.

Р. Ц.

Ворша.

„Прыняў памешчыцу".

Пры ўкамплектаваньні рагачэўскіх пэдагагічных курсаў, нават ужо пасьля ўкамплектаваньня, загадчык курсамі Лапцэвіч прыняў дачку памешчыцы з Гомельшчыны Клендукову, якая ўжо некалькі год таму назад скончыла самігодку і ня ведае зусім беларускае мовы. У той-жа час ён адмовіў другой грамадзянцы, якая не зьявілася своечасова на заняткі дзякуючы хваробе, на што ў апошняй ёсьць пасьведчаньне ад доктара.

Яшчэ горш абстаіць справа з прыёмам на пэдкурсы дзяцей асьветнікаў. Так, калі падаў заяву брат настаўніка С., дык Лапцэвіч адмовіў у прыёме матывіруючы тым, што ня выясьнена сацыяльнае становішча.

Наогул, клясавая лінія ў прыёме на пэдкурсы адсутнічала. Прымаў сам загадчык Лапцэвіч бяз ведама складзенай прыймовай камісіі.

Аб чым сьведчыць прыём Клендуковай—паходзячай з роду памешчыкаў і зачыненьне Лапцэвічам дзьвярэй перад працоўнымі? Трэба каму-небудзь гэтым зацікавіцца.

Я. Крушына.

на суд савецкай грамадзкасьці.

Пра Талочынскі Райвыканком і міліцыю, дзе сабралася гняздо жулікаў, ведаюць яшчэ з мінулага году. Частку іх разагналі, а частку пакінулі на завод, каб яны к новаму году далі свае вынікі.

Пакажам фактамі «шчырую» працу гэтага асінавага гнязда». Пасьля таго, як зьняў'і п'яніцу і растратчыка Шчокалава з Талочына, Кучынка, сакратара Райвыканкому, пасадзілі ў турму, застаўся яшчэ самы выдатны «Васіль Сьцяпанаў Савельлеў» названы газэтай «Камуністычны Шлях»—«з глыбокай кішэняй». У дадатак яшчэ пасадзілі сябра аднаго загадчыка камгасу Клышына, які, будучы старшынёй Друцкага сельсавету, нарабіў такіх спраў, што і да гэтага часу сьледчыя органы ламаюць галаву, і доўга бедната вёскі Друцк і яе ваколіц будуць памятаць працу Калышына. Пра яго працу ўся акруга ведае: піў самагон, браў хабары, рабіў падложныя акты аб продажы кароў. Рабіў розныя разьдзельныя акты, вызваляў заможных сялян ад падатку, рабіў ім скідкі, а беднату абкладаў. Цяпер гэтыя ўчынкі яму далі павышэньне—назначылі ў калгас Райвыканкому загадчыкам.

І тут ён таксама нарабіў спраў: так збудаваў Мураўніцкую школу, што нават і сяляне, не знаёмыя з тэхнікай, зразумелі гешэфт Калышына з спэкулянтам Ушвіцкім Зусем. Далі хабар рабочым, але яны выкрылі цёмныя справы, якую цягну (дастаўлялі і як будавалі печы і падмурак. У гэтай справе прымаў удзел і ад нарасьветы райёну Сучко Зьмітро, які дапамагаў набіваць кішэні. Калі сьледчы 6 вуч. пастанаваў зьняць Калышына, то Райвыканком усюды стараўся, каб пакінуць яго на працы, як добрага гаспадара і працаўніка. Як відаць, і знаёмы талочынцам Шпэер знаходзіцца ў адной кампаніі; на сумленных працаўнікоў паклёпы ўзводзіць, а гладзеў баровіць—добры чалавек усім дае і ўсім хапае: і казна цэлая і самі сыты. Дык гэта і вядома чаму—Сінічкін бароніць. Трэба глыбокія кішэні, каб заслужыць такога гонару. Але гэта робіць не адзін Калышын: загадчык Райзямаддзелу Савальлеў раскрадае народнае дабро в 1926 г. Яго, як вельмі сьвядомага жуліка, пакінулі на разводзе. Актам рэвізіі ад 9-16 верасьня 1926 г. выяўлена злачынласьць яго з садамі, як ён здаваў іх у аренду і як заключаў умовы, у выніку чаго дзяржава панесла вялікую страту; рабіў спэкулянтам-арэндатарам і сабе. А дзе грошы 250 руб. за Сакалянскі сад, як быццам зьвярнутыя арандатару 18-VII—26 г. І гэта не адзін сад, а 21.

Пачытайце, што кажа акт рэвізіі ад 28 кастрычніка 1927 г. Сады дык сады—ад садоў добры заработак, але шмат клопату, і год усё такі доўгі—на ўсе патрэбы грошай мала; дык ён, Савельлеў, як сьвядомы чалавек, коньмі пачаў гандляваць. Пры гандлі коньмі Савельлеў прадаў трое коняй і толькі 70 руб. запісаў на прыбытак у забюджэтныя сродкі (стар. 46, 20 студзеня 1926 г., прыходны ордэр № 1311), а рэшта грошай 450 руб. на прыбытку ня значацца і прысвоены Калышыным в Чапечкіным і іншымі. А дзе грошы, атрыманыя за пашу жывёлы, за злучку і г. д.? Усё ў Савельлева в кампаніяй. Узята ад арандатараў саду Вараноніча 1165 руб., і Савельлеў паехаў гандляваць і купляць коні. Толькі патэнту яму не хапала. І што-ж? Нагандляваў у сваю кішэню з паўтысячы. Рэвізія ўсё гэта выкрыла і зарэгістравала. А дзе грошы з крэдытнага таварыства 600 руб? Нідзе апраўдальных дакумантаў у РВК яма, парвалі, каб рэвізія не знайшла канцоў падроблевых рахункаў і дзе коні купілі. Але Савельлева прымаюць у РВК і пасьля гэтага. Усе канцы ўмее хаваць добра таксама бухгальтар Чапечкін, які навучыўся перасоўваць грошы з аднаго параграфу ў другі.

Але і ў 1928 г. кішэня Савельлева ня пустая. Скасілі 65 дзесяцін сенажаці, а запісалі толькі пудоў 700, трохі далі міліцыі. А міліцыя таксама шчодрая—ёй трэба зарабіць. Выдатныя асобы ёсьць і ў міліцыі, але пра іх скажам ніжэй. А цяпер скончым пра Савельлева. Шчодры ўсім сваім людзям, на чорны дзень трэба запасіць, бо ведае, што хутка кішэня парвецца. Ну, а фінчастка што і як думае? Радкевіч ужо паказаў працу ў газэце «Кам. Шлях.», але пра яго можна аставіць—скаргі сялянскія ляжаць без разбору. Пра гандаль стрэльбамі, як рэчавымі довадамі, увесь райён ведае. Калі-б зрабіць рэвізію, дык убачылі-б, што там робіцца. Стрэльба Баваровіча так і згінула з міліцыі невядома куды. Гарбачоў, начміліцыі, ужо аддаў свайму бацьку, ніж тым як стрэльба прададзена ня лічыцца. Лугаўцова стрэльба прададзена за 12 руб., а запісана на прыбытак 5 рублёў.

А як гандлюе сенам міліцыя! Колькі касілі дзесяцін, а дзе сена і каму аддадзена на схаваньне? А такія як Тодрык, Смалянкоў, Быкаў таксама вядомы ў райёне. Хуліганскія выхадкі Быкава вядомы. Вядомы бог і цар Жарабцоў, якому ўжо даўно ня месца ў міліцыі, як і Быкаву, але жулікаў і хабарнікаў прымаюць у міліцыю, і замест таго, каб злачынцаў выяўляць, пакрываюць такіх.

А спажывецкая кааперацыя ў асобе Шыловіча! Паглядзець, што тут робіцца? Народныя грошы звыш 3000 руб. і тут плачуць. Зрабілі для выпечкі хлеба 8 печак, а печы пустуюць. Ня гледзячы на тое, што пабудова пякарні была забаронена, Шыловіч змайстраваў новую. Як працуюць сталоўка і хлебапякарня пры ёй,—вядома ўсяму Талочыну. Хлеб даюць сыры, і рабакі ў хлебе, і ўсякі бруд. Нераз клікалі санітарную камісію, пісалі акты, але ўсе гінулі ў міліцыі. Не дарма каму хлеба няма ў сталоўцы, а начальніку міліцыі і яго памощніку ёсьць, бо акты ляжаць пад сукном. Заг. сталоўкай Рахлін гандлюе на дзве рукі—добры злодзей—яго даўно пастанавілі зьняць з працы, але яго трымаюць як жуліка і растратчыка. Піша пратаколы і міліцыя на Рахліна, але іх потым рве. Рахлін кажа: «Чорт вас ня возьме, не падохнеце і ад гэтага сырога хлеба».

А пагляньце, колькі грошай ідзе на сталоўку. Калі хто хоча ўзяць булку, дык бяры каўбасы ні сыру—гэта абавязкова. А сям'я Рахліна ўся харчуецца ў сталоўцы—проста «лавочка». А выдаткі Шыловіча на камандыроўкі дамоў, у Магілеўскую акругу, да сваёй жонкі? Калі гандляр Шыловіч, дык ва ўсім гандляр: мае адзін вэлёсыпэд, купіў у аўтадоры другі за 145 руб., а прадаў настаўніку за 225 руб. Гэта-б няхай і так было, але гандаль гэты ідзе не за свае грошы, а за народныя.

Хто-ж атрымлівае муку пшанічную? Вядома свая кампанія. А загляніце ў кааперацыю інвалідаў. Два заправілы Розіны—старшы і малодшы. Адзін Розін Янкель як спэкулянт памощнік брата ўжо сядзіць у турме і абвінавачваецца ў пасобніцтве ў дастаўцы спэкулянтам пшанічнай мукі. Не дарма Розін будуе трэці дом, бо з акту рэвізіі відаць, што ў краме № 1 ёсьць недахоп на суму 310 руб. 30 к., а ў краме № 2—лішкаў 132 руб. 29 кап. Чаму лішкі

ЯШЧЭ АДНО ДАСЯГНЕНЬНЕ

на фронце сацыялістычнага будаўніцтва.

За гады вайны Ляхаўка прыціхла. Заводы былі часткова разбураны а часткова з дрэнным і старым абсталяваньнем.

У першыя гады сацыялістычнага будаўніцтва Ляхаўка аджывала паступова: усюды абнаўлялася абсталяваньне, дабудоўваліся новыя цэхі. Але Ляхаўка была тады яшчэ старая.

Да 10 гадавіны кастрычніка на Ляхаўцы вырас вялікі будынак—ліцейны цэх заводу «Энэргія». Вырас цэлы шэраг будынкаў на другім баку вуліцы. Над імі, высока ўверх увьнялася ваданапорная вежа.

Гэта гарбарня «Бальшавік»—дзіця сацыялістычнага будаўніцтва.

Але гэтага мала.

Нядаўна, побач з былою трэцяю гарбарняю, рабіўся досьлед грунту, дзе павінен стаць новы вялікан—канцтэрская фабрыка. Грунт аказаўся вельмі добры.

У наступным будаўнічым сэзоне пачнецца пабудова вялікай канцтэрскай фабрыкі, разьлічанай, пры працы ў адну зьмену, на 500 рабочых.

Згодна праэкту, які ўжо зложан, за кожны год працы фабрыка дасьць на



ФАБРЫКА ЦУКРОВЫХ ВЫРАБАЎ.

4,5 мілёна рублёў прадукцыі. Пабудова фабрыкі будзе каштаваць 1600000 рублёў.

Наліччa ў Беларусі сыравіны (яблыкі, ягады, патака), пры павялічэньні за апошні год попыту на канцтэрскія вырабы на 60 проц., пабудова фабрыкі эканамічна выгадна.

Пры атрыманьні штогодна ад фабрыкі 600.000 руб. чыстага прыбытку, попыт беларускай каапэрацыі будзе поўнасьцю здаволен.

Ляхаўка аджывае...

Ляхаўка становіцца новаю.

С. Азерскі.

V ПЛЕНУМ ЦСПСБ.

ВЫНІКІ І ПЭРСПЭКТЫВЫ КАЛДАГАВОРНАЙ КАМПАНІІ.

Выбарачнае абсьледваньне паказала, што прафарганізацыі ня выпаўнілі дырэктыў III пленуму ў галіне праверкі выкананьня калдагавораў.

Нават там, дзе фабзавмясцкомы і праводзілі праверку, дык яна насіла кабінэтны характар, бо да праверкі ня былі прыцягнуты шырокія масы рабочых.

Адміністратары і гаспадарнікі ня лічыліся ні з дагаворамі, ні з дырэктывамі ўраду і часта затрымоўвалі выплату зарплаты на месяц і больш. У галіне аховы працы ня выконваліся адміністрацыямі нават такія дробязі, якія не патрабавалі вялікіх затрат. Спэцадзежнае выдавалася несвасчасова і дрэннай якасьці. Практыкаваўся прыём на работу бяз Біржы Працы.

З мінулага гаспадарчага году мы пачалі праводзіць тарыфную рэформу. Саюзныя органы павінны былі праверыць вынікі гэтай рэформы, але ня ўсе саюзы правялі гэтую працу. Нават і зараз ёсьць значная колькасьць рабочых, якія ня ведаюць аб існаваньні тарыфнай рэформы. Між тым саюзы павінны былі-б в рэформай шырока азнаёміць рабочыя масы.

З станоўчых бакоў можна адзначыць тое, што заработная плата рабочых павялічылася, і паменшыўся разрыў паміж аднолькавымі прадпрыёмствамі і катэгорыямі ў галіне аплаты рабочых.

На 1928-29 г., у параўнаньні з мінулым годам, зарплату па прамысловасьці ВСНГ БССР маркуецца павялічыць на 8 проц., а вытворчасьць працы павінна будзе павялічыцца на 17 проц.

Па прамысловасьці мясцовага значэньня павялічэньне зарплаты трэба будзе рабіць у кожным асобным выпадку ў залежнасьці ад магчымасьцяй і пытацца ўраўняць з прамысловасьцю ВСНГ. Прыдзецца падцягнуць зарплату ў трацкалектывах, бо там яна адстае.

У новую калдагаворную кампанію трэба ўцягнуць шырокія рабочыя масы. Масавая прапрацоўка калдагавораў павінна будзе ісьці ў лістападзе-сьнежні з такім разрахункам, каб у студзені іх заключыць. Прафарганізацыі павінны інфармаваць рабочых аб ходзе перагавораў з гаспадарнікамі. Калдагаворы павінны абгаварвацца ня толькі па цэхах, але і па зьменах, каб усе 100 проц. рабочых былі ўцягнуты ў калдагаворную кампанію.

ХТО ВІНАВАТ У НЕВЫКАНАНЬНІ КАЛДАГАВОРАЎ.

— Адміністрацыя ня лічыцца з калдагаворам і лічыць яго кавалкам паперы,—гаворыць т. Гдалін. Зьдзельшчыкам не даюць спэцвопраткі і нават чорнарабочым прыходзіцца працаваць без яе.

— Белсельтрэст яўна парушае свой дагавор,—кажа т. Калінін з Воршы, і прыводзіць да гэтага факты.

— Для праверкі выкананьня калдагавораў гаспадарніка ня здовіш. Культае тэхніка безапаснасьці, трэба больш месца адводзіць гэтаму пытаньню ў дагаворах,—зазначае т. Васільеў з Гомелю.

Наркампрацы т. Бэнэк у сваёй прамове спыніўся на тым, што самая важная работа ў калдагаворнай кампаніі—гэта падцягваньне зарплаты адсталых груп і недапушчэньне разьзыву ў ёй пры аднолькавай кваліфікацыі. Бываюць выпадкі, калі рабочыя адной і тэй-жа кваліфікацыі атрымоўваюць розную зарплату і кепска тое, што рабочыя па меншаму разраду адтрымоўваюць больш. Трэба ўсе гэтыя ненармальнасьці выпраўляць.

Прадстаўнік Полацку т. Плятнёў згадзіўся, што дырэктывы даваліся, але не праводзілі іх у жыцьцё; не рабілі праверкі выкананьняў калдагавораў.

Шэраг таварышоў спыняліся на тым, што за невыкананьне дагавораў трэба адміністрацыю прыцягнуць да адказнасьці. Адзначана яшчэ шэраг пытаньняў, на якія трэба зьвярнуць увагу пры правядзеньні калдагаворнай кампаніі. Для апрацоўкі рэвалюцыі абрана камісія.

Праца школы сярод неарганізаваных дзяцей.

Аб карысна-грамадзкай працы школы шмат гаварылася і пісалася. Практычныя вынікі гэтай працы ёсьць, але нязначныя, мала прыметныя. Пытаньне грамадзка-карыснай працы яшчэ ня стала ў патрэбнай меры актуальным пытаньнем у працы школы. А некаторыя віды гэтае працы напрашваюцца самі сабой.

Мастацкае выхаваньне вяўляецца зусім неабходным у агульнай сыстэме выхаваньня. Дзеці жывуць эмоцыянальна. Маюць запатрабаваньні ў задаволеньні сваіх пачуцьцёва-мастацкіх імкненьняў. Дзеці любяць музыку, сьпевы, кіно, тэатральныя пастаноўкі. Памянёныя запатрабаваньні ў дзяцей-вучняў задавальняюцца працай у гуртках, пастаноўкай вечароў.

Горш справа абстаіць з неарганізаванымі дзяцьмі вуліцы, якія дома (калі ён ёсьць) і на вуліцы бачаць грубыя сцэны лаянкі, хуліганства і г. д. Ад такіх сцэн дзецям хочацца адыйсьці, убачыць што-небудзь лепшае, прыгожае, бадзёрае. Вось чаму ў значнай меры дзеці з бою бяруць месца на тэатральных пастаноўках у хатах-чытальнях, у школах. Але часамі дзьверы настолькі моцна і шчыльна зачыняюцца, што папасьці туды цяжка. Тады яны пачынаюць хуліганіць: стукаюць у дзьверы, б'юць вокны, кідаюць каменьнем. У нашых мястэчках і гарадох, а таксама і ў вёсках такія зьявішчы бываюць часта. Ніякая міліцыя тут не дапамагае. Настаўнікі і загадчыкі хат-чытальняў ня ведаюць, што рабіць з такімі дзяцьмі, як бараніцца ад іх.

Мне здаецца, што трэба адчыніць для іх дзьверы школы і хат-чытальняў у часы пастаноўкі мастацкіх вечароў. Грамадзка-карысная праца школ у значнай меры павінна пайсьці па шляху ахопу неарганізаваных дзяцей, дзяцей вуліцы. Трэба даць ім магчымасьць прысутнічаць і бачыць дзейнасьць дзяцей-вучняў, чуць дэклямацыі, сьпевы, бачыць фізвыступленьні і г. д. Гэта дасьць для неарганізаваных дзяцей стымул да працы, да мастацкіх выступленьняў. І хто ведае, можа ў некаторых з закінутых дзяцей вылвяцца здольнасьці ў тым ці іншым напрамку. Выхаваўчае-ж значэньне такіх вечароў бязумоўна.

Магчыма, што неабходна арганізоўваць і ставіць спэцыяльныя вечары для памянёных неарганізаваных дзяцей.

В. Самцэвіч.

З ЛІСТОЎ РАБСЕЛЬКОРАЎ.

ЗУСІМ АДСТАЛЫЯ.

Зусім адсталі ад савецкага будаўніцтва сялне пасёлку Варшчыні Расьнянска раёну. Пьянства, карты і бойкі замяняюць культуру. Калі праводзілася самаабкладаньне, амаль усе жыхары пасёлку адмовіліся яго плаціць,

Ужо час сялянам зразумець, што гэтак ядобра рабіць.

Вока.

ТОРФАРАЗРАБОТКІ ПАШЫРАНЫ.

Значна пашыраны сёлета і палепшаны торфаразработкі на заводзе „Ратуме" ў Магілеўшчыне, Колькасьць здабываньня торфу ў параўнаньні з мінулым годам; павялічана на 50 проц. Таксама палепшана якасьць і павіжаны сябекошт торфу, дякуючы аднаўленьню абсталяваньня.

І. Ш.

ДРЭННЫЯ ПАЖАРНІКІ.

Дрэнна падрыхтавана Катновіцкая пажарная дружына, Самахвалавіцкага райёну да барацьбы з пажарамі. Калі ў вёсцы загарэлася лазьня, дык пажарнікі зьявіліся к канцу і замест таго, каб заняцца зьлікідаваньнем пажару яны заняліся лаянкай паміж сабою.

Дружыньнікі трэба ўзяцца за працу!

К. М.

КОНІ ДЛЯ ЎЛАСНЫХ СПРАЎ.

Амаль кожную нядзелю дзелавод райсюнага стала і машыністка Халопеніцкага РВК разьяжджаюць на райвыканкомаўскіх конях у госьці.

Ніяко так павінна быць?

Л.

ХРОНІКА.

Падрыхтоўка да Кастрычнікаўскіх урачысьтасьцяў.

НОВАЯ РАБОЧАЯ СТАЛОВАЯ.

Менскі мэрабком пастанавіў адчыніць да II-й гадавіны Кастрычнікавай рэвалюцыі новую рабочую сталовую.

Апошняя будзе знаходзіцца ў быўш. памашканьні „Лёто" (па Савецкай вул.).

КАМСАМОЛ—ДА КАСТРЫЧНІКАЎСКІХ УРАЧЫСТАСЬЦЯЎ.

Менскі Акругком ЛКСМБ пачаў рыхтавацца да сьвята Кастрычнікавай рэвалюцыі. У часе сьвята адбудуцца вечары камсамольскіх ячэек, на якіх будуць падагулены першыя вынікі культурнага паходу.

7-га лістапада камсамольцы наладжваюць спэцыяльны карнавал.

БРУКАВАНЬНЕ ЧЭРВЕНСКАГА ТРАКТУ.

Да Кастрычнікаўскіх урачыстасьцяў Менскім камгасам будзе закончана брукаваньне Чэрвенскага тракту (суп роць бойні). Апрача гэтага будзе закончана брукаваньне Нямігскай вуліцы.

Парадак выплаты зарплаты да 11-й гадавіны Кастрычнікавай рэвалюцыі.

Нар. Кам. Працы БССР пастанавіў зарплату рабочым і служачым дзяржаўных, каапэрацыйных, грамадзкіх, прыватных і іншых устаноў, прадпрыёмстваў і гаспадарак за 2-ю палову кастрычніка выплачваць у ўстаноўленыя тэрміны, але не пазьней 3-га лістапада.

Рабочым і служачым устаноў, якія знаходзяцца на дзяржаўным і мясцовым бюджэтах адначасова пастаноўлена з выплатай зарплаты, выдаць таксама аванс у разьмеры 25 проц. месячнага заработку за лістапад.

Рабочым і служачым іншых устаноў, прадпрыёмстваў і гаспадарак пастаноўлена таксама выдаць аванс у разьмеры 25 проц. месячнага заработку за лістапад па ўзгадненьні гэтага пытаньня паміж прафсаюзамі і адпаведнымі гаспадарчымі органамі.

Сьвяткаваньне 10-цігодзьдзя камсамолу.

29-га кастрычніка ў Доме Культуры адбудзецца ўрачыстае пасяджэньне ЦК і акругкому ЖКСМБ сумесна з партыйнымі і прафесыянальнымі арганізацыямі, прысьвечанае 10-цігодзьдзю камсамолу. Па пасяджэньні з дакладам аб 10-й гадавіне існаваньня камсамолу выступіць сэкратар ЦК ЛКСМБ тав. Галавач.

На сьвяткаваньне 10-цігодзьдзя камсамолу ў Менск прыяжджае украінская делегацыя камсамолу ў складзе 5 чал.

Зьезд БелАПП'у.

Паводле пастановы пленуму ЦБ „Маладняка" і часовага бюро БелАПП'у, (Беларуская асацыяцыя пралетарскіх пісьменьнікаў) 25-га лістапада скліканага зьезд БелАПП'у. У працы зьезду прымуць удзел «Маладняк», яўрэйская, польская і літоўская сэкцыі пралетарскіх пісьменьнікаў. На зьезьдзе будуць заслуханы справаздачы ЦБ «Маладняка», рэвізійнай камісіі і пацэсэкцыі. Апрача гэтага, будуць заслуханы даклады аб творчых шляхах пралетарскай літаратуры, стану сучаснай беларускай літаратуры; творчасьці „Маладняка" за 5 год.

На зьезьдзе будзе таксама пастаўлен даклад аб стварэньні БелАПП'у. Модус прадстаўніцтва—1 дэлегат ад 2-х правадзейных сяброў аб'яднаньня

Дапамога застрахаваным.

Па плану Галоўсацстраху на бягучы гаспадарчы год мае быць пранумчана праз летнія дамы адпачынку 3.100 застрахаваных і праз зімовыя дамы адпачынку—1000 застрахаваных.

Апрача гэтага будзе закуплена 227 курортных мейсц для хворых застрахаваных. Па плану сёлета таксама прадугледжваецца закончыць пабудовы будынкаў у санаторыі «Сасноўка» і пабудовы 2-х дамоў адпачынку.

Кантрактацыя зернавых культур.

Калегіяй Нар. Кам. Гандлю Саюзу зацьверджан плян кантрактацыі сельска-гаспадарчых культур у БССР на 1929 год. У наступным годзе ў БССР намечана кантрактацыя наступных культур: зернавых—50.000 гэктар., лёна—30000 гэкт., ільнянога семені—12.000 гэктараў, канапель—2.500 гэктараў, бульбы—15.000 гэктар.

У параўнаньні з мінулым годам кантрактацыя па бульбе павышана на 100 проц. і лёну—на 50 проц.

У праўленьні БДУ.

У сувязі з прызначэньнем С. З. Слоніма намесьнікам Нар. Кам. Асьветы БССР, намесьнікам рэктара Беларускага Дзяржаўнага Унівэрсытэту назначан навуковы працаўнік Беларускага Камуністычнага Унівэрсытэту тав. Каранеўскі.

Адначасова з гэтым даабраны ў праўленьне БДУ тав. Стасевіч

Да выпуску вэтэрынарных дактароў.

Зараз скончылі Беларускі Вэтэрынарны Інстытут 75 асоб, з якіх у можах БССР застанецца працаваць каля 50 асоб. Усе скончыўшыя вэтэрынары працуюць ужо на вучастках.

Наступны выпуск адбудзецца праз 2 гады, бо з сёлетняга году ў Інстытуце ўводзіцца 5-цігадавы курс навучаньня.

Вывучэньне стану татарскага насельніцтва.

Нацкамісія ЦВК БССР даручыла Менскай акруговай нацкамісіі правесьці дасьледаваньне гаспадарчага і культурнага стану татарскага насельніцтва г. Менску і м. Вузды. У м. Сьмілавічы дзеля гэтай мэты будзе камандыраваны сэкратар нацкамісіі ЦВК БССР т. Будзін.

Вынікі конкурсу на лепшага ўкладчыка.

24 кастрычніка ў галоўнай касе ашчадкасы адбыўся пасяджэньне конкурснай камісіі для вызначэньня прэмій лепшым укладчыкам Менскай акругі.

Да конкурсу было дапушчана 35 чалавек, якія завербавалі 362 новых укладчыкаў у касы ашчадкасы.

Было прысуджана 5 прэмій, якія атрымалі ўкладчыкі № 2190, № 28—чырвонаармеец, 2-ю і 3-ю прэміі, № 206—жыхар м. Смалявічы і № 6—рабочы Менскага заводу «Бальшавік».

Прэміі—плуг прымус і інш.

Забясьпечаньне БССР мануфактурай.

У першым квартале бягучага году для забясьпечаньня БССР будзе завезена 153 вагоны бавоўнянай мануфактуры. З гэтай колькасьці будзе пакіравана ў сельскія мясцовасьці 112 вагонаў суп роць астатніх 36 за гэты-ж квартал.

Апрача таго на гэты пэрыяд будзе завезена суконна-шарсьцяной мануфактуры на 640000 руб., з якіх асноўная маса пойдзе ў вёску. У вёску будзе накіравана гэтай мануфактуры на 480000 руб. і апрача таго на 197000 р. галаўных хустак.

1200000 пуд. хлеба завязуць у лістападзе.

Паводле вестак з Саюзнага Наркамгандлю ў лістападзе месяцы ў БССР будзе завезена 1200000 пуд. хлебапрадуктаў, з іх 700000 пуд. жыта і жытняй мукі, а рэшта пшаніцы. З гэтай колькасьці рабочая каапэрацыя атрымае 250000 пуд. жыта і мукі і 150000 пуд. пшаніцы. Рэшта хлебапрадуктаў завозіцца для спажывецкай і транспартнай каапэрацыі і саюзхлеба.

Дыскусія аб падвышэньні ўраджайнасьці.

Для падвышэньня ўраджайнасьці ў БССР, Нар. Кам. Земляробства БССР пастанавіў правесьці шырокую дыскусію па пытаньнях ураджайнасьці.

Апошняя будзе абмяркоўвацца на пленумах РВК, сельсаветаў і г. д.

Дыскусія павінна быць закончана да 15 сьнежня, з тым, каб не вынікі былі абмеркаваны на прадстаўчай усебеларускай агранамічнай нарадзе.

Апавяшчэньні.

Мен. Акр. Савет Саюзу Бязбожнікаў паведамляе, што ў суботу 27 кастрычніка, а 7-й гадз. увечары, у памяшканьні клюбу «К. Маркса» (уваход з вул. Энгельса) пачынае працаваць антырэлігійная семінарыя на расейскай мове, пад кіраўніцтвам дацэнта Усьпенскага і прафэсара Нікольскага, на якую запрашаюцца т. т. скончыўшыя антырэлігійныя курсы і т. т., якія ў сучасны момант кіруюць антырэлігійнымі гурткамі (на расейскай і беларускай мовах) на прадпрыёмствах і ўстановах гор. Менску.

Запіс у семінарыю адбываецца ў Акр. Савеце СБ штодзённа ад 6 да 8 гадз. увечары.

СХОД «МАЛАДНЯКА».

Сёньня, 26 кастрычнік, сход Менскай філіі Маладняка.

На нараду дню: даклад т. М. Гарэцкага «Аб творчасьці Маладняка».

Пачатак роўна а 7 гадз. Уваход вольны.

Сход адбудзецца ў малой залі клюбу К. Маркса (уваход з вуліцы Энгельса).

Бюро філіі.

ДОМ АСЬВЕТЫ.

Сёньня, а 7 гадз. увечары—заняткі палітгурсаў.

Гурток кройкі і шыцьця працуе ў 7 гадз. увечары.

Менскі дзень.

— Скончыўся ўсебеларускі зьезд савгандальслужачых. Старшынёй саюзу абран, замест тав. Араноўіча, тав. Мурашыч.

— Друкаваную насьценную газэту выпускаюць рабочыя 1-й Дзяржаўнай друкарні, прысьвечаную да 11-й гадавіны Кастрычнікавай рэвалюцыі

— Усебеларускія курсы ліквідатараў непісьменнасьці з 22-га кастрычніка распачалі сваю працу. Курсы разьлічаны на 50 чал.

— 1000 руб. сабрана па Менску ў часе трохдзённіка дапамогі сялянам. Каля 800 руб. сабрана скарбоначным зборам.

— 55000 пуд. падсонечнага алею будзе завезена ў кастрычніку-сьнежані для забясьпечаньня насельніцтва БССР. З іх 20000 пуд. для шырокага рынку, а рэшта для лёнаводных раёнаў.

— 25 проц. культфондаў Цэрабкопаў будзе перададзена фабзавмясцкомам і праўленьням клюбаў выключна на пашыраньне каапэрацыйнай асьветы.

— Дадо месца атрымала ў БССР на курсах працаўнікоў грамадзкага харчаваньня ў Маскве. ЦП саюзу нарэчарчаньня выдзеліла на курсы т. Велікасельца. Белрабсэкцыя кандыдатуру зацьвердзіла.

— На першы квартал вызначана для шырокага рынку БССР 1176 тон гатункового жалеза і 830 тон дахавага.

У Менск прыяжджае праф. Вільямс.

У хуткім часе ў Менск прыяжджае для працы ў Навукова-Дасьледчым Інстытуце Сельскай і Лясной гаспадаркі імя Леніна і Беларускім Дзяржаўным Унівэрсытэце вядомы вучоны спэцыяліст па сельскай гаспадарцы—праф. А. Ф. Вільямс.

СУД.

Безгаспадарчасьць інспэктара Штэйнфеля.

Леанід Штэйнфель, па прафэсіі санітарны ўрач, займаў пасаду інспэктара аховы здароўя на гораду Барысаву да ліквідаваньня акругі. Маючы вакол сябе сваіх людзей, Штэйнфель мала займаўся аховай здароўя, а ў большасьці лавіў рыбу ў мутнай вадзе, і пільна ахоўваў сваю кішэню. У лютым м-цы г. г., калі дзейнасьць Штэйнфеля дакацілася да РСІ, была зроблена рэвізія, якая выявіла наступнае: Штэйнфель любіў камандыроўкі, у большасьці ён езьдзіў у Маскву куляць мэдыцынскія прылады, але каштоўнасьць іх была куды меншая, чым камандаравачныя.

З дасятакам будаўніных работ Перэльманам Штэйнфель жыў у згодзе. Калі патрабавалася законнае шкло, якога ў Барысаве было шмат і купіць яго можна было таньна, Штэйнфель камандыраваў Перэльмана ў Маскву.

Будучы ў верасьні 1927 г. у чарговым водпуску ў Маскве, Штэйнфель, маючы там радню ў прыватна-каапэрацыйным т-ве „Москоопмет" закупіў 200 ложкаў па суму 10000 р. для новай больніцы, у той час, як больніца не пабудавана і па гэты час. Ложкі цэлер ляжаць без скарыстаньня і псуюцца, а ў Менску іх матчыма было купіць шмат таней. Таксама Штэйнфель палічыў свой водпуск, як камандыроўку і незаконна выпісаў сабе значную сму камандыровачных.

Калі Штэйнфелю было дадзена заданьне занцца вывучэньнем прафшкодніцтва на барысаўскіх фабрыках, ён хоць ніякай працы на гэтай галіне не праводзіў, але выплаціў 2 дактарам 1118 р. 75 к., а ўрач Каем хоць і ня лічыцца на гэтай працы, але грошы атрымала. Будаўнік Перэльман, праца якога скончылася ў сьнежні месяцы, атрымліваў пэнсію на 140 р. у м-ц з нагрузкай на сакавік м-ц і толькі быў зволен рэвізійнай камісіяй.

Акрамя злоўжываньняў Штэйнфель займаўся і пратэкцыянізмам: ён, калі патрабавалася ў сухотны дыспансэр сястра, выпісаў з Масквы сваю радню Драбінскую, якая членам саюзу не состаяла і на пасаду сястры падрыхтавана ня была.

У Барысаве проста хадзілі чуткі, што Штэйнфель зьбірае вакол сябе сваіх людзей, каб пры дапамозе іх лепш набіваць сваю кішэню.

Выязная сэсія Менскага акруговага суду ў Барысаве на падставе 1 ч. 105 арт. К. К. прыгаварыла былога інспэктара Леаніда Штэйнфеля на 2 гады зьняволеньня бяз суровага адмежаваньня.

К.

Новыя кнігі.

Наступілі ў рэдакцыю „Савецкая Беларусь" для рэцэнзіі наступныя кнігі.

1. „Асьвета" № 5-6. Часопіс Народнага Камісарыяту Асьветы і саюзу працаўнікоў асьветы. Стар. 244, цана 1 руб. 50 кап. Выданьне Наркамасьветы БССР.

2. „На заласох ад сьмерці". Пязьвычайныя апавяданьні з жыцьця дзікіх і асвоеных мядзьведзяў. Пад рэдакцыяй Ів. Цьвіевіча. Стар. 80, цана 35 кап. Выданьне Беларускага Дзяржаўнага Выдавецтва.

3. «Статистическое обозрение», № 8 Стар. 158, цана 1 руб. 75 кап. Выданьне ЦСУ Саюзу ССР, Масква.

ПРАЦА МОПР'У БССР.

(З пленуму ЦК МОПР'у).

Скончыўся пленум ЦК Мопр'у БССР. На пленум зьехалася 25 прадстаўнікоў Мопр'у з округ і раёнаў БССР.

На першым сваім пасяджэньні пленум падагуліў вынікі праведзеных за апошнае паўгодзьдзе масавых палітакампаній. Важнейшымі за гэты пэрыяд зьявіліся—кампанія зімовай дапамогі, кампанія арэтэсту супроць фашысцкага тэрору, кампанія дапамогі кітайскай рэвалюцыі і кампанія прысьвечаная 6-му кангрэсу Камінтэрну.

За час гэтых кампаній у шэрагі Мопр'у БССР узлося каля 15000 новых сяброў Мопр'у, прычым, рост адбыўся, галоўным чынам, за кошт сялянства, і сабрана на дапамогу барцам рэвалюцыі (па пяпоўных ліньіях) каля 63227 руб.

Апрача гэтага, кампаніі межі вялізарнае палітыка-выхаваўчае значэньне. Асабліва вялікае значэньне мае ў гэтых адносінах кампанія, прысьвечаная 6-му кангрэсу Камінтэрну.

На гэтым-жа пасяджэньні пленумам была прынята адозва да ўсіх сяброў Мопр'у і да ўсіх працоўных БССР у зьвязку з забастовачным рухам у Польшчы.

Асабліва шмат увагі і вялікая актыўнасьць была праяўлена членамі пленуму на пытаньню аб чарговых задачах Мопр'у. Пленумам прыняты шэраг пастаноў у гэтым якасьнага палепшэньня працы нізавых арганізацый Мопр'у.

Шмат увагі было таксама ўдзелена пленумам пытаньню аб працы Мопр'у на вёсцы. Пленумам канстатавана, што агульнае становішча працы Мопр'у на вёсцы слабае: сялянства ў шэрагі Мопр'у ўцягнута яшчэ ў недастатковай меры. Пленумам прынятыя шэраг рашэньняў па ўзмацненьню працы на вёсцы, па ўцягненьню ў гэту працу ўсіх культурных сіл вёскі.

Што работу на вёсцы можна паставіць на моцную вышыню, паказаў на пленуме справаздачны даклад Клічаўскага раёнаму Мопр'у (Бабруйшчына). Па пастаноўцы працы Мопр'у гэты раён можа з моцным правам лічыцца прыкладным.

На пленуме быў заслуханы таксама даклад Мазырскага акругкому Мопр'у. Пленум канстатаваў, што за апошнія 2 месяцы ў працах акругкому Мопр'у адчувасьцца значнае аздараўленьне, пасьля вялікага шэрыду «заціпша». Пленум працаваў на працагу 3 дзён в вялікай інтэнсыўнасьці і ў гісторыю мопраўскага руху БССР будзе мець вялікае значэньне.

Мясцовым арганізацыям Мопр'у за асноўе рашэньняў пленуму прыдзецца зарэкурэбэна паправаць над тым, каб працу вМопр'у ў БССР падняць на яшчэ больш высокую ступень.

Правілы прыёму

на завочнае навучаньне ў Камуністычным Унівэрсытэце Беларусі імя У. І. Леніна.

1. Завочнае навучаньне, арганізоўваемае Камуністычным Унівэрсытэтам Беларусі імя У. І. Леніна, ставіць сваёй мэтай прадставіць партыйнаму і камсамольскаму актыву магчымасьць павысіць узровень сваёй марксысцка-ленінскай падрыхтоўкі без адрыву ад вытворчай грамадзкай працы на працягы тэрміна.

2. Вывучэньне курсу завочнага Камуністычнага Унівэрсытэту, уключаючага грамадзка-палітычныя дысцыпліны, разьлічана на 3-хгадовы тэрмін (40 тыдняў у год) пры 8 гадз. заняткаў на I і III годзе навучаньня і 10 гадз. у тыдзень на—II-м.

3. Завочнае навучаньне праводзіцца на падставе самастойных заняткаў па заданьнях і метадычных указаньнях, дасылаемых кожнаму завочніку. Кансультацыя вучняў, шляхам пісьмовае перапіскі і праверкі правідловасьці прысваеньня самастойна прапрацоўваемага матар'ялу праз рацыяналізаваньне пісьмовых прац, акцыцыўляецца Кам. Унівэрсытэтам. Як дапамогаю, навучаючыяся на месцах карыстаюцца кансультацыямі пры Гомельскай, Віцебскай, Магілеўскай савпартшколах, а ў іншых акругах—у кабінэтах агітпрапаганды акругкомаў.

4. Парткамітэты павінны: а) весьці вучот завочна навучаючыхся, на прадмет урэгуляваньня іх нагрузкі з тым, каб завочнікі мелі рэальную магчымасьць праводзіць сыстэматычныя заняткі (3 вольных вечароў у тыдзень); б) арганізаваць і праводзіць асабовую і групавую кансультацыю вучэбна-мэтадычнага зьместу (пры кабінэтах агітпропрацы, мясцовых савпартшколах, альбо пры бюро самаадукацыі); в) забясьпечыць завочнікам магчымасьць карыстаньня літаратурай і падручнікамі з мясцовых бібліятэк.

5. Навучаньне рэкамэндуемых акругкомамі праводзіцца бясплатна.

Увага: На расходы на рассылку заданьняў, рэцэнзій, адказаў на запытаньні, паперу і інш. устанаўліваецца плата в кожнага завочніка—3 руб. у год.

Матар'яльна незабясьпечаныя т. т. у асобных выпадках вызваляюцца ад гэтае платы акругкомамі.

6. На завочнае навучаньне Камуністычным Унівэрсытэтам Беларусі прымаюцца асобы, здавальняючыя наступным умовам: а) партыйны стаж і стаж актыўнае грамадзка-партыйнае працы ня менш 2-х гадоў, а пры наліччы 3-х гадоў стажу ЛКСМБ—ня менш 1 году партстажу; б) вытворчы стаж фізычнае працы ў прамысловасьці або ў сельскай гаспадарцы ня менш 2-х гадоў; в) палітычная падрыхтоўка ня ніжэй узроўню праграмы сярэдніх ступеняў партасьветы (вяч. савпартшколы, гурткі—школы тыпу «Б»); г) дастатковая агульная граматнасьць, дазваляючая самастойна прапрацоўваць рэкамэндуемую літаратуру—уменьне на пісьме выкладаць свае думкі, рабіць арытмэтычныя дзеяньні над цэлымі лічбамі і дробамі; д) пры ўсіх гэтых умовах перавага даецца ўдзельнікам у грамадзянскай вайне і служачым у Чырвонай арміі.

7. Жадаючыя папасьці ў лік «завочнікаў», павінны быць прапушчаны на месцах праз адборчыя камісіі пры акругкомах у складзе: заг. агітпрападдзелам (старшыня), прадстаўнік аргаддзелу і заг. агітпрападдзелу акругкому ЛКСМБ.

У сваёй працы камісіі кіруюцца гэтымі умовамі прыёму.

8. Мясцовыя адборчыя камісіі канчаюць сваю працу да 5-га лістапада з тым, каб 15-га лістапада 1928 году ў Кам. Унівэрсытэце Беларусі імя У. І. Леніна (Менск, Унівэрсытэцкая, 27) былі прадстаўлены сьпісы адабраных на завочнае навучаньне з іх запоўненымі і пасьведчанымі парткомамі анкетамі, узоры якіх адначасна дасылаюцца.

Разьвёрстка па акругкомам

Менскаму	50
Віцебскаму	40
Гомельскаму	44
Магілёўскаму	18
Бабруйскаму	18
Аршанскаму	20
Полацкаму	20
Мазырскаму	15

Акругкомы адбіраюць і пасылаюць матар'ялы ў адборачную камісію Кам. Унівэрсытэту на 50 проц. больш патрэбнага ліку для адпаведнага падбору.

9. У завочным Кам. Унівэрсытэце вучэбны плян разьмяркоўваецца на гадоў у наступным парадку:

1-шы год навучаньня:

Эканаміч. геаграфія	120 г.
Гісторыя Расеі	130 г.
Гісторыя Заходу	180 г.
	430 г.

2 год навучаньня:

Гісторыя Белар.	80 г.
Палітэканомія	180 г.
Гіст. ВКП(б) і КП(б)Б	210 г.
	470 г.

3 год навучаньня:

Гіст. бел. літар.	30 г.
Эканомпалітык.	110 г.
Дыялект. матар.	160 г.
Ленінізм	160 г.
	460 г.

Увага: Можна праходзіць на ўсе прадметы курсу завочнага Кім. Унівэрсытэту, а толькі 1 альбо 2 прадметы, гледзячы на выбару самага завочніка.

Сакратар ЦК КП(б)Б Васілевіч.

Заг. АПА ЦК КП(б)Б Стасевіч.

Рэктар Кам. Унівэрсытэту Беларусі імя У. І. Леніна Гэльтман.

Адказны рэдактар М. КУДЗЕЛЬКА.

ЗГУБЛЕНЫ.

— Рэвальвэр «браўнінг» № 2, пасьведчаньне на права наношэньня зброі, выд. Кубанскім АДПУ на імя Прыса І. П., кв. 81.

— Пячатка Лікмавіцкага с-гасп. т-ва «Шахарь» Калінкавіцкага раёну Мазырск. акр., кв. 82

— Вучотна—вайсковая кніжка № 2г Гаўхоўскага Д. Л., выд. Калінінскім вайсковым камісарам, кв. № 83.

— Каапэрац. кніжка № 647 Кулікоўскай Ю. Г., выд. Чэрвенскім ЦРК, кв. 84.

— Заборная кніжка № 3223 Марозава А, М., выд. Барысаўскім ЦРК, кв. 85.

— Дапрызыўная кніжка Шоўчэнка Г., выд. Халопеніцкім РВК, кв. 86.

— Каапэрац. кніжка № 5915 Макарчыка К. Д., выд. Барысаўскім ЦРК, кв. 87.

— Дапрызыўная кніжка Марозав К. В., выд. 4-м адд. Ленінградз. міліц., кв. 88.

— Пашпарт Патроўскага Г. П., выд Менакрміліц. кв. № 74.

— Каапэрац. кніжка Прафімовіча Ф., выд. Пегаградзкск. чыгун. крамай, кв. 17.

— Білет за № 76 Івашкевіча Б. А., выд. курсамі ЦІТА, кв. 18.

— Асабовае пасьведчаньне № 337 Івашкевіча Б. А., выд. Заходн. чыгунк. кв. 19.

— Мэтрычн. выпіс Івашкевіча Б. А., выд. Прывакзальнай царквою, кв. 20.

— Вучотна-конская карт. Бандаровіча А., выд. Чэрвенскім вайсковым сталам, кв. 21.

— Сяброўскі білет за № 1410 Кіпіча А., выд. Слуцкім саюзам савгандальслужачых, кв. 22.

— Пашпарт за № 131 Папарынай М.Ф., выд. Мазырск. акрміліц., кв. 23.

— Каапэрац. кніжка № 28826 Рывінай І. А., выд. МЦРК, кв. 24.

— Каапэрац. кніжка Чарно Б. Х., выд. МЦРК, кв. 25.

— Пасьведчаньне, выд. Маскоўскім праўленьнем кан. «Камунар» на імя Вігдаровіча Л. І., кв. 26.

— Сяброўскі білет № 3621 Вігдаровіча Л. І., выд. маскоўск. губ. адд. саюзу савгандальслуж., кв. 27.

— Каапэрац. кніжка № 706 Арэнзай Е., выд. Барысаўск. ЦРК, кв. 28.

— Каапэрац. кніжка № 16921 Эйдзіна В. І., выд. МЦРК, кв. 29

— Сяброўскі білет № 22222 Шічуна І. Г., выд. саюзам мытнічч. кв. 30.

— Каапэрац. кніжка Некрашэвіч Д. М., выд. МЦРК кв. 31.

— Каапэрац. кніжка № 13997